Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

9 ЛІПЕНЯ 2009 г.
ЧАЦВЕР
№ 125
(26483)

Кошт 550 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Пісьмо ў нумар

БЯРОЗКА... ВЫХАВАЛЬНІЦА

Мікраграён Малінаўка — малады, усё ў ім маладое: і дамы, і абсалютная большасць жыхароў, і дрэўцы. Хораша яны пасаджаны. Нават шкадавата крыху, што не мной. Але ж...

Іду неяк раз у краму. Побач з тратуарам своеасаблівы скверык — роўныя радочкі дрэў. У скверыку стараваты чалавек і гадоў сямі-васьмі хлопчык. Відаць, дзед... Гуляе з унукам.

Праўдзівей, безумоўна ж, гуляў, забаўляўся малы: падскокваў то да аднаго, то да другога дрэўца, хапаўся аберуч і павісаў, прыгінаючы аж да зямлі. Дзядуля ўсміхаўся, відаць, любаваўся спрытам унука.

Я прыпыніўся, хацеў паўшчуваць іх — асабліва старога — за тое, што дазваляе дзіцяці такую бязглуздую гульню. Але... не паспеў — чарговае дрэўца хруснула і, надломленае, вершалінкай панікла да зямлі. Дзед аж рагатнуў ад задавальнення. А ў мяне... не павярнуўся язык яму нешта сказаць. Я хуценька вярнуўся дамоў, узяў чыстую анучку, намачыў яе вадой, каб не так сушыла месца надлому, і праз хвіліны ўжо быў ля бярозкі, падняў яе і стаў туга перавязваць. Унук перастаў дурніцца і неяк недаўменна пазіраў на мяне. Моўчкі глядзеў і дзед. Потым пакруціў пальцам ля скроні, узяў за руку ўнука і сышоў. Ён.

...А я цяпер кожны раз, калі праходжу па тым тратуары, абавязкова гляджу на сваю бярозку. І дзіўна — прайшоў амаль год, а ніводнага дрэўца ў гэтым скверыку, дзякуй Богу, не зламана, не пашкоджана. Можа бярозка сваёй белай павязкай, як знакам бяды, сароміць, стрымлівае свядомых і несвядомых вандалаў?

Вось толькі ствол у выхавальніцы цяпер не стройны: верхняй сваёй палоўкай яна нахілілася ўбок, да... майго дома.

Можа, кланяецца яму? А мо проста пакрыўдзілася на людзей і адвярнулася.

Іван СТАДОЛЬНІК, *г. Мінск.*

Мінпрацы і сацабароны спадзяецца на павышэнне дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў у 2009 годзе

Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі спадзяецца на павышэнне памеру штомесячнай дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў ужо ў гэтым годзе. Аб гэтым паведаміў на прэс-канферэнцыі начальнік галоўнага ўпраўлення палітыкі занятасці і народанасельніцтва міністэрства Мікалай Коханаў, адказваючы на пытанне карэспандэнта БЕЛТА.

Узмацненне дзяржаўнай падтрымкі сем'яў у сувязі з нараджэннем і выхаваннем дзяцей прадугледжана мерапрыемствамі падпраграмы «Сацыяльная абарона сям'і і дзяцей» Прэзідэнцкай праграмы «Дзеці Беларусі», іншымі нарматыўнымі прававымі актамі. «Крызісы прыходзяць і адыходзяць, а меры стымулявання нараджальнасці не страчваюць свайго прыярытэтнага значэння», — сказаў Мікалай Коханаў.

Цяпер памер дапамогі па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім узросту 3 гады складае 80 працэнтаў бюджэту пражыткавага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва (з 1 мая па 31 ліпеня гэтага года гэты від дзяржпадтрымкі сем'яў — Br194 тыс. 860 у месяц). Прапануецца павялічыць памер дапамогі да 100 працэнтаў БПМ. Дарэчы, сродкі на гэтыя мэты прадугледжаны ў Фондзе сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацабароны.

БЕЛТА.

Падпіска-2009

НОВЫМ ПАДПІСЧЫКАМ — НОВЫЯ ПРЫЗЫ

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Учора ў сценах рэдакцыі прайшоў чарговы штоквартальны розыгрыш прызоў сярод нашых падпісчыкаў.

Прыемна, што настольныя гадзіннікі з лагатыпам «Звязды», каляровыя тэлевізары «Віцязь», а таксама халадзільнік «Атлант» «разышліся» па ўсёй Беларусі. А вяршыцелямі людскіх лёсаў па традыцыі сталі нашы госці. На гэты раз звяздоўскія прызы знайшлі сваіх новых гаспадароў з лёгкай рукі намесніка дырэктара Мінскага філіяла РУП «Белпошта» Алены Трубач (на фота злева), начальніка Мінскага аб'яднанага цэнтра паштовай сувязі Алены Ішчук і нашага пастаяннага падпісчыка Анастаса Семяновіча, які адданы газеце «Звязда» больш за 40 гадоў і зараз знаходзіцца на заслужаным адпачынку. Падрабязнасці розыгрышу і спісы пераможцаў — у наступным нумары газеты.

Кар. «Звязды».

Рознічныя цэны на звадкаваны газ для аўтатранспарту павышаны на 10 працэнтаў

Мінімальная рознічная цана на звадкаваны газ пры рэалізацыі на аўтамабільных газазаправачных станцыях у Беларусі з 8 ліпеня павышана на 10,2 працэнта да Br1300 за 1 л. Адпаведнае рашэнне змяшчаецца ў пастанове Міністэрства эканомікі № 121, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў Міністэрстве эканомікі. З 8 ліпеня максімальная рознічная цана на звадкаваны газ для запраўкі аўтатранспарту складае Br1370 за 1 л (рост на 9,6 працэнта).

КАЛІ Ў ПЕРШАЙ ДЗЕІ ЁСЦЬ СТРЭЛЬБА...

Егер, які выйшаў на незаконнае паляванне, стаў ахвярай замест звера.

38-гадовы супрацоўнік Палескага дзяржаўнага радыяцыйна-экалагічнага запаведніка вывеў на начное паляванне ва ўрочышча Лозы каля вёскі Рудніша Лельчыцкага раёна свайго 39-гадовага знаёмага, рабочага мясцовага прадпрыемства меліярацыйных сістэм. Той зрабіў стрэл карцеччу з паляўнічай стрэльбы 16-га калібру ў бок магчымага з'яўлення звера. Але трапіў у сябра, які прывёў яго на паляванне. Егер памёр на месцы здарэння, а грамадзянін кінуў сваю стрэльбу ў меліярацыйны канал. Затрыманы не з'яўляецца паляўнічым, а зброя, з якой адбыўся ракавы стрэл, яму дасталася ў спадчыну ад нядаўна памерлага сваяка.

У рэанімацыі Рэчыцкай раённай бальніцы цяпер знаходзіцца яшчэ адзін аматар палявання без ліцэнзіі. 36-гадовы гамяльчанін выйшаў у лес разам з 58-гадовым пенсіянерам з вёскі Старая Якімаўка Рэчыцкага раёна. Кабана выгнаць не атрымалася і бліжэй да вечара паляўнічыя вырашылі адпачыць. Маладзейшы мужчына папрасіў у старэйшага паказаць яго стрэльбу, і калі вяртаў яе ствалом на сябе, уладальнік зброі, які ўзяў яе за прыклад, выпадкова зачапіў узведзены спускавы кручок. Вынік стрэлу: скразное раненне ў пах. У парушэнне вызначаных правілаў на прывале стрэльба не была разраджана і быў узведзены спускавы кручок.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ISSN 1990 - 763X

Канферэнц-зала

Самы багаты беларус заплаціў за год каля 400 млн рублёў падаткаў

Гадавы план па зборы падаткаў будзе выкананы, паведаміў учора журналістам намеснік міністра па падатках і зборах Васіль КАМЕНКА.

У прыватнасці, спецыяліст адзначыў, што за першае паўгоддзе ў Беларусі падатковыя арганізацыі накіравалі ў бюджэт 14,8 трлн рублёў даходаў, што адпавядае 97,3 працэнта ад плана. Недабор падаткаў склаў 413,3 млрд рублёў. Васіль Каменка адзначыў, што збор падаткаў сёлета ўскладніўся ў сувязі са скарачэннем вытворчасці прадукцыі і не вельмі добрымі паказчыкамі па знешнім гандлі. Разам з тым, ужо цяпер бачна, як станоўча дзейнічае комплекс першачарговых антыкрызісных мераў, распрацаваных Урадам. У выніку ўжо ў другім квартале бюджэт атрымаў на 496 млрд рублёў падатковых плацяжоў больш, чым за першыя тры месяцы года. Намеснік міністра ўпэўнены, што калі такія тэмпы павелічэння аб'ёмаў падаткаў захаваюцца, то гадавы план папаўнення бюджэту яны выканаюць.

Васіль Каменка адзначыў, што з пачатку года ва ўсіх абласных цэнтрах падатковыя інспекцыі гатовыя прымаць дэкларацыі ад юрыдычных асобаў у электронным выглядзе. А з цягам часу электронныя дэкларацыі будуць прымацца ад прадпрыемстваў па ўсёй тэрыторыі краіны.

Сёлета інспекцыямі канчаткова падведзены вынікі кампаніі дэкларавання сукупнага гадавога даходу, паведаміла журналістам **начальнік галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асобаў Міністэрства па падатках і зборах Беларусі Галіна РАДЗЮКЕВІЧ.**

Па выніках мінулага года ў падатковыя інспекцыі было пададзена 80 тысяч дэкларацый, падаткаплацельшчыкам прапанавана дадаткова заплаціць 18 млрд рублёў падаходнага падатку. Разам з тым, грамадзянам згодна з дэкларацыямі, вернута 12 млрд рублёў. Спецыялістамі падатковай галіны падлічана, што 3,6 працэнта дэкларантаў запаўнялі дакументы аб сукупным гадавым даходзе з парушэннямі.

Адказваючы на пытанне «Звязды», Галіна Радзюкевіч адзначыла, што падаткавікамі быў зафіксаваны самы вялікі сукупны гадавы даход аднаго жыхара Мінска ў памеры больш як адзін мільярд рублёў. З гэтых даходаў буйны прадпрымальнік заплаціў за год каля 400 млн рублёў падаткаў.

Дарэчы, сёлета спецыялістамі ведамства вядзецца больш актыўная кантрольная дзейнасць пры праверках дэкларацый. З пачатку года было праверана 11 тысяч чалавек, якім дадаткова даналічана заплаціць каля 4,5 млрд рублёў падаткаў і штрафаў.

Сяргей КУРКАЧ.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 9.07.2009 г. (для б/н разлікаў)

▲ 1 долар ЗША	2 861,00
▲ 1 еўра	3 974,79
1 латвійскі лат	5 704,89
1 літоўскі літ	1 151,84
1 чэшская крона	152,70
1 польскі злоты	899,61
▼ 1 расійскі рубель	90,02
1 украінская грыўня	373,50

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	31,7819
10 UAH	41,4637
1000 BYR	11,1476
EUR	44,1387

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

Радавыя Перамогі

АПОШНІ ШАВЕЦ ПАЛЕССЯ ПІСАЎ НА ВАЙНЕ «ПАХАВАНКІ»

Знайшоў яго па падказцы жыхароў Давыд-Гарадка, у якіх на гарышчах яшчэ захоўваюцца боты, пашытыя паўстагоддзя таму і нават даўней. Вы чулі, каб пра боты казалі «вуцяжкі», каб халявы гэтых ботаў былі вышэйшыя за калена? Я ўяўлення не меў, пакуль на ўласныя вочы не пабачыў гэты арыгінальны абутковы выраб, зроблены з суцэльнага кавалка ялавічнай скуры, без швоў, замест жалезных цвікоў у яго падэшвы заганяліся драўляныя. Зносу такому абутку не было. Гэта цяпер здзіўляешся, раней жа на Палессі боты-выцяжкі былі звычайнымі. І спецыялістаў было тады процьма. Асабліва ў месце сапраўдных майстроў — Давыд-Гарадку. «Цяпер я апошні «шовэц», — кажа на палескі манер ***Міхаіл Паўлавіч ДЗІСЬ****, адкладваючы убок шавецкі рыштунак і адсоўваючыся ад швачнай машынкі знакамітай фірмы «Зінгер». За шкельцамі тоўстых лінзаў акуляраў блішчаць жывыя і дапытлівыя вочы, нягледзячы на тое, што майстру праз некалькі дзён будзе дзевяноста. Унікальная асоба, згадзіцеся. Ён яшчэ шые, яшчэ запатрабаваны! Разгаварыліся. Я ледзь паспяваў за ім занатоўваць успаміны.*

— Шыць навучыўся ад бацькі. Першыя боты пашыў у пятнаццаць гадоў і зарабіў за іх дваццаць злотых (пуд збожжа ў той час каштаваў два злотыя). А ваяваць пайшоў у абмотках, бо бедны быў.

На вайне Міхаіл Дзісь быў кулямётчыкам 2-га Беларускага фронту пад камандаваннем Жукава. Прызнаецца, што цяжка давялося і пад Рыгай, і на Вісле, і на Одары. Але дайшоў да рэйхстага... А яшчэ ён быў ротным пісарам, пісаў «пахаванкі» на загінулых аднапалчан. Вярнуўся з вайны толькі ў 1946-м.

«Скажы, чаму пасля вайны нам забаранялі шыць, як, дарэчы, і ўсялякую ручную і вельмі патрэбную працу? Вось і сышлі добрыя майстры».

Цяпер ветэран-шавец шые «бу́рачкі» для жанчын, унты на зіму замест валёнак. Зразумела, гэта не «вуцяжкі» трыццатых гадоў і нават не скураныя боцікі для модніц шасцідзесятых. Тым не менш праца мадэльная, толькі сапраўднаму майстру пад сілу. Усё ж не фабрычная штампоўка.

Як ні імкнуся, не магу ўявіць сучаснага пятнаццацігадовага падлетка за шавецкім столікам з рыштункам, які мог бы пашыць нават самы звычайны абутак. А вось Міхаіла Паўлавіча Дзіся ўяўляю лёгка. Ён нарадзіўся такім: з іголкаю ў руках.

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.

г. Давыд-Гарадок, Столінскі раён.

АДКУЛЬ РЫБА?

У Браславе супрацоўнікамі Глыбоцкага міжраённага аддзялення ўпраўлення Дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю за незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць была затрымана жыхарка гэтага горада, якая гандлявала вэнджанай рыбай. Падчас праверкі было канфіскавана 318 кілаграмаў замарожанай рыбы, у тым ліку 246 кілаграмаў вугра. Вядзецца разбор.

Сяргей РАСОЛЬКА.

УСХОД — ДАЛЁКА НЕ ЎСЁ

За апошні час доля расійскага рынку ў агульным экспарце беларускай малочнай прадукцыі скарацілася з 94 да 80 %. Пры гэтым дыверсіфікацыя паставак працягнецца і надалей. У прыватнасці, як паведаміў міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Сямён ШАПІРА, вядзецца актыўны пошук новых спажыўцоў у краінах Персідскага заліва, Лацінскай Амерыкі, Афрыкі, ва Украіне, у Малдове, Казахстане, Туркменістане і іншых постсавецкіх дзяржавах.

Якія нашы «лішкі»?

Невялікая па памерах Беларусь вырабляе 1 % сусветнага аб'ёму малака, экспартуе 2 % зноў-такі сусветнага аб'ёму сыру і 4 % масла. Гэта стала непасрэдным вынікам захавання буйной вытворчасці, прычым, паводле слоў міністра, такі падыход правільны. Большасць постсавецкіх краін зрабіла стаўку на прыватніка, аднак з-за старэння насельніцтва прыватны статак працягвае скарачацца. Беларусь не з'яўляецца выключэннем — толькі за мінулы год колькасць кароў на вясковых падворках зменшылася з 250 да 220 тысяч. Аднак гэта падзенне з лішкам ліквідаваў грамадскі сектар: сёння ў ім налічваецца 1 мільён 220 тысяч кароў, яшчэ год таму гэта лічба складала 1 мільён 205 тысяч.

Тым часам, з улікам павелічэння надояў, склалася сітуацыя, калі вытворчасць у Беларусі ўдвая перавышае рэкамендаваную норму «ўнутранага» спажывання — 320 кілаграмаў малочных прадуктаў на чалавека ў год. А адсюль — і актуальнасць тэмы экспарту.

Расіяне «б'юць»... саляркай

Працяглы час праблем не ўзнікала, беларускае малако купляла Расія. Тым самым суседняя краіна забяспечвала стабільную работу сваіх жа прадпрыемстваў — па сутнасці ўласная сельская гаспадарка забяспечвала крыху больш за 80 % ад патрэбы перапрацоўшчыкаў. Дэфіцыт сыравіны кампенсоўвала Беларусь. І ў тым ліку за кошт сухога малака, якое выраблялася без выкарыстання дабавак, простым выпарванненм вадкасці. Да чэрвеня такая раскладка, здаецца, задавальняла ўсіх. А далей пачаліся абвінавачванні — маўляў, Беларусь залішне датуе сваіх вытворцаў і такім чынам мае магчымасці дэмпінгаваць на рынку.

— Сапраўды, датацыі для галіны ёсць, але далёка не ўсе яны звязаныя з цэнаўтварэннем — бюджэтныя грошы ідуць на тую ж меліярацыю ці вапнаванне глебы, — адзначыў Сямён Шапіра. — Да таго ж сцвярджаць, што палітыку найбольшага спрыяння не выкарыстоўвае і суседняя краіна, нельга. Фактычна літр малака ў нас каштуе як тры літры саляркі, тады як у Расіі — толькі як паўтара. І гэта — істотная канкурэнтная перавага расійскіх сялян.

Хто перамог у «малочнай вайне»?

Ці не галоўнае патрабаванне расійскага боку — прыбраць са свайго рынку беларускае сухое малако, прынамсі, улетку. Пры гэтым, зазначыў Сямён Шапіра, не варта шукаць выключна палітычныя падтэксты. На першым плане аказаўся чыста эканамічны інтарэс — з-за нізкай цаны на беларускае малако расійскія перапрацоўшчыкі адмаўляліся ад натуральнага малака сваіх жа вытворцаў. Зрэшты, у нашым Мінсельгасхарчы паставіліся да праблемы з разуменнем. Тым больш што рэальная кан'юнктура рынку прывяла да таго, што вытворчасць сухога малака была стратнай.

У выніку з'явіўся кампрамісе: Беларусь скарачае пастаўкі сухога малака, але пры гэтым павялічвае экспарт сыру на 15 % і экспарт натуральнамалочнай прадукцыі — кефіру, ёгуртаў, смятаны. Такім чынам, наша краіна дакладна не прайграла. Хутчэй, наадварот: паводле новага балансу, беларускі экспарт малочнай прадукцыі ў Расію... узрасце на 130 мільярдаў рублёў.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Прыёмная кампанія-2009

ПАДРЫХТОЎКА АБІТУРЫЕНТАЎ ПА ДАКЛАДНЫХ НАВУКАХ НЕ ПАЛЕПШЫЛАСЯ

Колькасць уладальнікаў стабальных сертыфікатаў цэнтралізаванага тэсціравання павялічылася ў гэтым годзе ўтрая — абсалютным вынікам могуць пахваліцца 206 абітурыентаў (летась такіх шчасліўцаў было 77). Аднак калі ў мінулым годзе рэкордная за ўсю гісторыю правядзення ЦТ колькасць стабальнікаў была зарэгістравана на іспытах па матэматыцы (55 чалавек), то сёлета проста бліскучыя веды прадэманстравалі ўдзельнікі ЦТ па беларускай мове, у якіх 122 стабальныя вынікі.

Як паведаміў учора на сустрэчы з журналістамі ў Нацыянальным прэс-цэнтры **дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалай ФЯСЬКОЎ,** на фоне росту максімальных вынікаў сёлета скарацілася і колькасць нулявых вынікаў, што пацвярджае рэальнасць патрабаванняў да ведаў абітурыентаў і сведчыць пра істотнае спрашчэнне педагагічных тэстаў. Дарэчы, нягледзячы на апасенні наконт неканкурэнтаздольнасці выпускнікоў, якія навучаліся па пераходных вучэбных праграмах, істотнай розніцы ў сярэднім бале выпускнікоў 11-х і 11-х штрых-класаў не назіраецца.

— Я хачу паведаміць, што ўсе стабальнікі — гэта невыпадковыя людзі, — падкрэсліў Мікалай Фяськоў. — Мы заўсёды цікавімся школьнымі адзнакамі такіх абітурыентаў, месцам іх вучобы, педагогамі, якія працавалі з гэтымі дзецьмі, і вынікамі цэнтралізаванага тэсціравання па іншых дысцыплінах. Магу вас запэўніць, што гэта добра падрыхтаваныя і ўсебакова развітыя маладыя людзі. Як правіла, і па двух іншых тэстах вынікі ў гэтых маладых людзей не ніжэйшыя чым 90 балаў. Па выніках цэнтралізаванага тэсціравання па хіміі чатыры «стабальнікі» ў гэтым годзе — выпускнікі Ліцэя БДУ. Хімічная, фізічная, матэматычная школы ў гэтай навучальнай установе надзвычай моцныя, што ліцэісты пастаянна пацвярджаюць на розных міжнародных інтэлектуальных спаборніцтвах.

Праўда, ёсць і супрацьлеглыя прыклады, калі вучні, якія маюць у школе высокія адзнакі, на тэсціраванні набіраюць дастаткова нізкія балы. Так, выпускнік гомельскай школы, які меў у атэстаце васьмёрку па матэматыцы, здолеў набраць на тэсціраванні толькі адзін бал, што, зразумела, выклікала шок у яго сям'і.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

НАЗВАНЫ ТРЫ КРАІНЫ ЕС З РОСТАМ У ЭКАНОМІЦЫ

Па выніках першага квартала 2009 года ВУП скарачаецца ў 24 з 27 краін Еўрасаюза. Выключэннем сталі Кіпр, дзе эканоміка ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года вырасла на 1,5 працэнта, Польшча (рост на 1,9 працэнта) і Грэцыя (рост на 0,3 працэнта).

У цэлым па Еўропе ВУП скарачыўся на 4,7 працэнта ў параўнанні з першым кварталам 2008 года і на 2,4 працэнта ў параўнанні з чацвёртым кварталам. Лідарамі тут сталі тры прыбалтыйскія дзяржавы: у Латвіі абвал эканомікі ў гадавым вылічэнні склаў 18,1 працэнта, у Эстоніі — 15,1 працэнта, а ў Літве — 11,8 працэнта.

У найбуйнейшых эканоміках ЕС таксама зафіксаваны спад. У Германіі ён склаў 6,9 працэнта ў год, у Францыі — 3,2 працэнта, у Італіі — 6 працэнтаў, у Вялікабрытаніі — 4,9 працэнта.

Не вельмі аптымістычныя паказчыкі і ў найбуйнейшых партнёраў ЕС. Так, у Японіі ВУП у першым квартале скарачыўся на 8,4 працэнта ў гадавым вылічэнні, а ЗША — на 2,5 працэнта, у Расіі — 9,8 працэнта.

У ОМСКУ ЎЗАРВАЎСЯ БЫТАВЫ ГАЗ. ЁСЦЬ ПАЦЯРПЕЛЫЯ

Выбух, як мяркуецца, бытавога газу адбыўся ў кватэры сямейнага інтэрната ў Омску. Шпіталізавана пяцёра пацярпелых, сярод іх адно малое дзіця.

Згодна з папярэдняй інфармацыяй, выбух адбыўся на чацвёртым паверсе ў кватэры другога пад'езда пяціпавярховага цаглянага дома. На месцы здарэння працуюць выратавальнікі. Ужо выратаваны два чалавекі.

ПАМЕЖНУЮ СЦЯНУ Ў ЗША АБ'ЯВІЛІ НЕБЯСПЕЧНАЙ ДЛЯ ДЗІКАЙ ПРЫРОДЫ

Абаронная сцяна, якую ЗША ўзводзяць на мяжы з Мексікай, будзе несці пагрозу для дзікай прыроды. Біёлагі папярэдзілі, што агароджа працягласцю каля 1100 кіламетраў перашкодзіць перамяшчэнню жывёл паміж тэрыторыямі дзвюх краін і створыць небяспеку для папуляцый некаторых відаў.

Аўтары даследавання падкрэсліваюць, што негатыўны эфект сцяны можна было б значна зменшыць шляхам унясення ва ўрадавы праект некаторых змяненняў. Напрыклад, прапануецца ўсталяваць каля агароджы жэрдкі і насадзіць кусты.

Будаўніцтва сцяны на мяжы ЗША і Мексікі было распачата адміністрацыяй Джорджа Буша і працягваецца да цяперашняга часу. Агароджы ўсталёўваюцца на шляху ў інтэнсіўных патокаў нелегальных імігрантаў і кантрабандыстаў. На пачатак 2009 года агульная колькасць працягласці агароджаў перавысіла 900 кіламетраў.

ПАЛЕСІНЦАМ ЗАБАРАНІЛІ ЖАНІЦЦА БЕЗ ДАВЕДКІ АБ АДСУТНАСЦІ ГРЫПУ H1N1

Вярхоўны суддзя шарыяцкага суда Палесцінскай аўтаноміі абвясціў фетву, якая забараняе заключэнне шлюбаў у выніку заражэння аднаго з маладажонаў грыпам H1N1.

Па словах вярхоўнага суддзі, прыняцце гэтай меры было выклікана павелічэннем колькасці тых, хто захварэў на новы грып, і накіравана на барацьбу з далейшым распаўсюджваннем інфекцыі ў рэгіёне.

У абвешчанай фетве гаворыцца, што рэлігійныя суды Палесцінскай аўтаноміі могуць правесці працэдуру шлюбу толькі пасля падачы будучымі мужам і жонкай даведак, завераных Міністэрствам аховы здароўя, аб адсутнасці ў іх віруса грыпу H1N1.

Агульная колькасць захварэлых на грып H1N1 у Палесцінскай аўтаноміі дасягнула на 7 ліпеня 69 чалавек.

Народны паэт Беларусі Рыгор БАРАДУЛІН:

«Я ДА ГЭТАГА ЧАСУ СЯБЕ ВІНАВАЧУ, ШТО МАЛА МАМЕ ПІСАЎ...»

Пару дзён таму выйшла з друку ўнікальная кніга — перапіска Рыгора Барадуліна з мамай. Першыя лісты датуюцца 1954 годам, калі будучы Народны паэт Беларусі паехаў з родных Ушачаў у Мінск на філфак БДУ, апошнія — 1971 годам, калі мама Акуліна Андрэеўна памерла... Уклалі кнігу, якая называецца «Паслаў бы табе душу...», Наталля Давыдзенка і Сяргей Шапран. Атрымалася 270 старонак вялікага фармату, шмат рэдкіх фотаздымкаў.

Калі я прачытаў гэтую кнігу, мне перадалося адчуванне сораму, якое і зараз жыве ў Дзядзькі Рыгора за недастатковую ўвагі да мамы. Перадалося і адчуванне трывогі ў вялікім маміным сэрцы за адзінага сына-гарэзу.

Кнігу ўжо паспелі назваць дапаможнікам — як трэба любіць бацькоў. І напамінам — што трэба рабіць гэта своечасова. Сам Рыгор Барадулін ужо праз 10 гадоў пасля смерці мамы напіша такія радкі:

Наведвайце бацькоў, пакуль яны жывыя,
Пакуль дымяцца коміны — нагрэйцеся ў бацькоў.
Калі адчай вякоў гайнёй ваўкоў завые,
Не трэба анікому ён, сум ля сляпых слупкоў.

Гэтая кніга ў многім напоўненая драматызмам — у лістах можна прасачыць, як сын пачынае аддаляцца ад мамы, пачынае злоўжываць алкаголем, рэдка прыязджае дамоў... Тое, што гэтае ліставанне надрукавана — яшчэ адно сведчанне маштабу асобы Барадуліна, ягонай гранічнай шчырасці і прыстойнасці. Далёка не кожны наважыўся б надрукаваць такія лісты.

Пра кнігу «Паслаў бы табе душу...» мы гутарым з Рыгорам Барадуліным.

Фота Уладзіміра КРУКА.

Мама літаральна дыхала на адзінага сына...

— Дзядзька Рыгор, калі я пабачыў кнігу яшчэ ў рукапісе, у мяне ўзнікла, так бы мовіць, пытанне далікатнасці. У многіх маміных лістах адчуваецца трывога за вашае празмернае ўжыванне алкаголю, яе крыўда за сыновую няўвагу... Ці не вагаліся вы: даваць — не даваць?..

— Разумееце, мне дарагі кожны мамін радок — як голас мамы. Таму мы нічога не правілі. Вялікі дзякуй укладальнікам кнігі — Наталлі Давыдзенцы і Сяргею Шапрану. Бо ідэя ўзнікла яшчэ калі я працаваў у выдавецтве «Мастацкая літаратура». Я паказаў Наталлі адзін ліст — і яна сказала: «Давай будзем рабіць кніжку». Мінула колькі гадоў, я сабраў усе пісьмы, Сяргей і Наталля ўпарадкавалі іх храналагічна, апрацавалі — і кніга выйшла.

— Як вам удалося захаваць гэтыя лісты цягам 50 гадоў? Вы ж столькі пераязджалі з кватэры на кватэру...

— Я захоўваў як мог. Можа, толькі некалькі лістоў згубілася...

— Атрымліваецца, што і мама вашая гэтак жа ашчадна захоўвала лісты?

— Безумоўна! Яны ўсе былі складзеныя асобна, не заўжды з канвертам, не заўжды па парадку... Калі я перабудоўваў хату, я іх ашчадна сабраў — і затым перанёс ужо ў новы дом.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Парламенцкі дзённік

У нагу з Рыйгікагу

Беларуска-эстонскія міжпарламенцкія сувязі маюць задзел для актывізацыі

Эстонія стане яшчэ бліжэйшай да Беларусі: у Мінску адкрыецца дыпламатычнае прадстаўніцтва гэтай краіны, беларуская місія ўвосень таксама пачне работу ў Таліне, паведаміў **Уладзімір ВЕЛЬМАН, кіраўнік дэпутацкай групы Рыйгікагу (эстонскага парламента) па парламенцкіх сувязях з Беларуссю,** падчас сустрэчы ў Палаце прадстаўнікоў.

Група была ўтворана ў Рыйгікагу ў канцы зімы 2009 года, яна мае шырокае прадстаўніцтва. Эстонскаму боку хацелася б ведаць вектар руху Беларусі, усталяваць трывалыя, адкрытыя кантакты: «Мы з цікавасцю гатовы гутарыць на любыя тэмы». Замежны госць адзначыў, што намячаецца паляпшэнне беларуска-эстонскіх стасункаў па афіцыйнай лініі. І парламенцкія кантакты, на яго думку, павінны некалькі апярэдзіць гэта паляпшэнне. Эстонскі палітык падкрэсліў таксама пазітыўныя тэндэнцыі ў адносінах Беларусі з ЕС. У гэтым кантэксце, натуральна, адбываецца і пацяпленне двухбаковых адносінаў.

Парламенцкія кантакты ўплываюць на развіццё эканамічнага супрацоўніцтва — упэўнены **Сяргей МАСКЕВІЧ, старшыня пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах і сувязях з СНД.** Узровень даверу фарміруецца, калі ёсць стасункі на ўзроўні парламентаў. Дэпутат дадаў, што ў Беларусі мноства прадпрыемстваў з эстонскім капіталам. «У нашых стасунках вялікія рэзервы, але ёсць і задзел».

Ала МАЧАЛАВА.

«Беларусбанк» прадстаўляе... мастацкую самадзейнасць

Да нядаўніх святочных падзей быў прымеркаваны фінал фестываля-конкурсу мастацкай самадзейнасці супрацоўнікаў ААТ «АБ «Беларусбанк» «Зямлі роднай пяём мы славу».

Правядзенне такога агляду-конкурсу рэспубліканскага маштабу — падзея традыцыйная, аднак кожны раз фінальнае мерапрыемства ўражвае нечаканым размахам талентаў самадзейных спевакоў, музыкантаў, танцораў, чытачоў, якія працуюць у вядучай крэдытна-фінансавай установе краіны. Незлічоную колькасць узнагарод у шэрагу намінацый уручыў старшыня журы, намеснік старшыні Праўлення, дырэктар дэпартамента персаналу Уладзімір Занько. Паводле слоў старшыні Праўлення ААТ «АБ «Беларусбанк» Надзеі Ермаковай, угоўле кожнае выступленне на заключным канцэрце, які праходзіў, дарэчы, на сцэне Палаца культуры Мінскага аўтамабільнага завода, — ужо ёсць перамога, а галоўная ўзнагарода для адораных банкіраў — станоўчыя пачуцці ўдзячных гледачоў.

Святлана БАРЫСЕНКА.

У СУДЫ МІНСКА ЗА ПЕРШАЕ ПАЎГОДДЗЕ ПАДАДЗЕНА 115 ІСКАЎ АБ ВЫСЯЛЕННІ ЗА ДАЎГІ ПА КВАРТПЛАЦЕ

Пра гэта паведаміў генеральны дырэктар ГВА «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка» Уладзімір Рэянтовіч на аператыўнай нарадзе ў Мінгарвыканкаме. Акрамя таго, пададзена 2911 іскавых заяў аб утрыманні пратэрмінаванай запазычанасці з зарплаты тых, хто не плаціў па рахунках больш за два месяцы. Усяго такіх мінчан сёння 2947, вось толькі знайсці 36, якія засталіся, камунальнікам не ўдалося, таму што няпамятлівыя грамадзяне не жывуць па месцы рэгістрацыі. Уладзімір Рэянтовіч адзначыў, што сталічныя камунальнікі актывізавалі работу з даўжнікамі. За першае паўгоддзе гэтага года яны правялі фактычна столькі ж мерапрыемстваў, як за 9 месяцаў 2008-га. У выніку дамагліся неблагога выніку. За жыллёва-камунальныя паслугі, атрыманыя ў маі, мінчане цалкам разлічыліся. Усяго ў чэрвені сабрана 646 мільёнаў рублёў, прычым у гэту суму ўвайшлі не толькі аплачаныя майскія жыроўкі. Некаторыя жыхары сталіцы вярнулі даўгі за папярэднія месяцы.

Святлана ФРАЛЯНКОВА, *«Мінск—Навіны».*

УСХОД — ДАЛЁКА НЕ ЎСЁ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Дарэчы, міністр паведаміў: паводле дамоўленасці, беларускія перапрацоўшчыкі малака далі на выпрабаванне расіянам 550 узораў сваёй прадукцыі. На сёння 102 узоры ўжо атрымалі санітарна-гігіенічнае заключэнне, а 78 — і новыя расійскія сертыфікаты адпаведнасці.

Праверкі стануць узаемнымі

Між тым, літаральна ў апошнія дні з'явілася новая праблема. На гэты раз ужо з боку Расельгаснагляда. Расійская ветэрынарная служба забараніла пастаўкі сыру з 11 беларускіх заводаў. З афіцыйным тлумачэннем — залішняе ўтрыманне ў прадукцыі антыбіётыкаў.

На сёння праблема нібыта знікла — пастаўкі сыру аднавіліся. Аднак пытанні засталіся.

— У Беларусі дзейнічаюць больш строгія патрабаванні, чым у Еўрасаюзе ці ЗША, — падкрэсліў Сямён Шапіра. — Аднак новыя расійскія стандарты вызначаюць: утрыманне антыбіётыкаў павінна быць нулявым. Гэта ўмова амаль нерэальная — не сакрэт, што каровы хварэюць ці часам ядуць вільготнае, крыху з цвіллю, сена. Таму мы перакананыя: новыя правілы не вытрымае ніхто, і ў тым ліку — непасрэдна расійскія вытворцы.

Да слова, міністр адзначыў: у найбліжэйшы час Беларусь таксама наладзіць татальную праверку еўрапейскіх і расійскіх прадуктаў харчавання на тыя ж антыбіётыкі і іншыя кампаненты — тэхнічныя магчымасці тут ужо ёсць. Праўда, пакуль у Мінсельгасхарчы ўсё ж лічаць за лепшае ўстрымацца ад далейшых больш радыкальных крокаў.

Не прадаваць, аднак... мяняцца?

Яшчэ адна вострая тэма — прыватызацыя беларускіх малочных прадпрыемстваў расіянамі. Пазіцыя Мінсельгасхарча на гэты конт адназначная: продажу заводаў, а тым больш за бесцань, не будзе.

Разам з тым Сямён Шапіра заўважыў: ніхто не супраць укладання грошай у перапрацоўку і ў тым ліку — грошай з-за мяжы. Аднак на пэўных умовах. Так, інвестарам можа прапаноўвацца доля ў капітале айчынных заводаў або іншы варыянт — абмен акцыямі паміж беларускімі і замежнымі прадпрыемствамі.

Праблема — толькі «Растсельмаш»

І з апошняга. Як вядома, днямі ўрад Расіі прыняў рашэнне — увесці для падтрымкі «Растсельмаша» павышаныя мыты на імпарт сельгастэхнікі. І ў прыватнасці, сельгастэхнікі з Беларусі. Аднак у Мінсельгасхарчы перакананыя: такі крок пазбаўлены логікі.

— Сёлета ў Беларусі плануецца купіць для вёскі паўтары тысячы камбайнаў, прычым гэта — далёка не дастатковая лічба, — зазначае Сямён Шапіра. — У той жа час для такой буйной краіны, як Расія завод у Растове здольны вырабіць усяго 4 тысячы машын. Адпаведна, атрымліваецца: праблема не ў сельгастэхніцы з Беларусі, а ў магутнасцях «Растсельмаша». Прычым зразумела: у рэшце рэшт гэта праблема будзе вырашацца за кошт «Лексіёнаў» і «Джон Дзіраў».

Сяргей ГРЫБ.

ПАДРЫХТОЎКА АБІТУРЫЕНТАЎ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Увогуле, не сакрэт, што кожны год самыя горшыя вынікі беларускія абітурыенты дэманструюць на ЦТ па матэматыцы і фізіцы. Увогуле ўзровень падрыхтоўкі па дакладных дысцыплінах даволі значнай колькасці абітурыентаў працягвае зніжацца. Вынікі ўдзельнікаў ЦТ гэтага года сведчаць пра тое, што матэматычная падрыхтоўка беларускіх абітурыентаў, на жаль, не палепшылася. Так, амаль 27 тысяч чалавек, што складае 24 працэнты ад агульнай колькасці ўдзельнікаў ЦТ па матэматыцы, атрымалі па гэтай дысцыпліне 10 балаў і менш. Летась пераважная колькасць уладальнікаў такіх нізкіх балаў не былі б дапушчаныя да ўдзелу ў конкурсе. Але сёлета ў конкурсе можна ўдзельнічаць нават з адным тэставым балам. Між іншым, 254 абітурыенты (0,23 працэнта ад агульнай колькасці) заваршылі выпрабаванне ўвогуле з нулявым вынікам.

80 балаў і больш набралі толькі 1,5 працэнта абітурыентаў (гэта крыху больш як 1,5 тысячы чалавек). 50 балаў і больш — больш як 14 тысяч чалавек (12,4 працэнта). Да 100 балаў «дацягнуліся» ў гэтым годзе 32 абітурыенты (летась было 55 абсалютных вынікаў). Адзін абітурыент набраў 97 балаў, 5 чалавек — 96 балаў і 119 чалавек — 95 тэставых балаў.

Па фізіцы 70 працэнтаў абітурыентаў набралі 20 і менш балаў. І толькі два абітурыенты здолелі набраць 100 балаў па гэтай дысцыпліне.

— Нават папярэдні аналіз сведчыць пра тое, што самыя нізкія вынікі дэманструюць выпускнікі папярэдніх гадоў, а таксама выпускнікі прафесійна-тэхнічных і сярэдніх спецыяльных навучальных установ, якія не заўсёды могуць пахваліцца добрай агульнаадукацыйнай падрыхтоўкай, — канстатуе Мікалай Фяскоў. — Таму яны і не вытрымліваюць канкурэнцыі. А лепшыя вынікі — у выпускнікоў гімназій і ліцэяў, што таксама не стала для нас нечаканасцю. Дарэчы, мы заўважылі, што ўжо праз год пасля заканчэння школы пры паўтарэнні спробы паступлення абітурыенты дэманструюць горшыя вынікі — узровень іх ведаў рэзка зніжаецца. Аднак абітурыенты, якія закончылі школу да 1996 года, дэманструюць больш стабільныя веды. І ўсё ж такі, калі ўлічыць, што матэматыка і фізіка з'яўляюцца, як правіла, профільнымі экзаменацыйнымі дысцыплінамі (яе здаюць будучыя інжынеры, канструктары, праграмісты, матэматыкі), то хацелася б, каб нулявых вынікаў усё ж такі не было. Тым больш што ў тэстах маюцца элементарныя заданні, адказы на якія можна даць увогуле без пісьмовых падлікаў... Напрыклад, сёлета ў нас былі ў тэстах па матэматыцы заданні, з якімі справіліся больш як 90 працэнтаў удзельнікаў.

З 31 597 чалавек, якія здавалі біялогію, 2417 чалавек (7,65 працэнта) не змаглі правільна назваць на малюнку органы кветкавай расліны — ліст, корань, кветку. «Не пазналі» на малюнку ліст расліны 5 працэнтаў абітурыентаў, а з кветкай «не знаёмыя» 20 працэнтаў абітурыентаў.

Так, абітурыентам было прапанавана вызначыць дыяганаль паралелаграма. Справіліся з гэтай задачай 93,1 працэнта, але 7 працэнтаў усё адно не змаглі даць правільны адказ на элементарную задачку. Ці, напрыклад, на графіку змянення тэмпературы на працягу сутак трэба было вызначыць, якая была тэмпература ў 10 гадзін. Для 90,7 працэнта абітурыентаў ніякіх цяжкасцяў не было, але для 9 працэнтаў «расшыфраваць» графік аказалася праблематычным.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

— Нас заўсёды папракалі ў празмернай складанасці тэстаў, таму мы свядома пайшлі на ўключэнне сёлета ў тэсты такіх элементарных заданняў. І што ў выніку атрымалі? Практычна ўсе абітурыенты з імі справіліся, — падкрэсліў Мікалай Фяскоў. — Між іншым, каэфіцыент складанасці любога задання залежыць ад колькасці абітурыентаў, якія далі на яго правільны адказ. Чым меншая колькасць справілася, тым большую «вагу» мае такое заданне пры падліку тэставага бала і наадварот. Абітурыенты, якія набралі нуль тэставых балаў, таксама справіліся з гэтымі заданнямі, вось толькі іх «вага» была некалькі сотых ці дзясятых бала. Такім чынам, пры наяўнасці аднаго ці двух правільна выкананых заданняў абітурыенты ўсё адно атрымалі нуль тэставых балаў. Я хачу, каб усе зразумелі, што лёгкія заданні маюць дрэнную дыферэнцыравальную здольнасць і не могуць выкарыстоўвацца для складання рэйтынгавага спісу прэтэндэнтаў на студэнцкі білет, як і звышскладаныя заданні, з якімі не зможа справіцца ні адзін з абітурыентаў.

Мікалай Фяскоў канстатаваў, што з кожным годам колькасць абітурыентаў, якія здаюць на цэнтралізаваным тэсціраванні беларускую мову, працягвае змяншацца. На яго думку, гэта можа быць звязана з тым, што, як правіла, дзеці, якія выбіраюць на ЦТ беларускую мову, аднолькава добра валодаюць і беларускай, і рускай мовамі. Таму на фоне зніжэння агульнай моўнай адукаванасці маладых людзей не варта здзіўляцца, што змяншаецца і колькасць абітурыентаў, якія свядома робяць выбар на карысць беларускай мовы, па меркаванні многіх, больш складанай. Па словах Мікалая Фяскова, у абітурыентаў ёсць магчымасць выбару мовы пры здачы тэста і па ўсіх іншых дысцыплінах. На ЦТ па гісторыі Беларусі 62 працэнты яго ўдзельнікаў абралі менавіта беларускую мову, на ЦТ па сусветнай гісторыі — 10 працэнтаў, а на іншых дысцыплінах колькасць маладых людзей, якія пажадалі здаваць тэсты на беларускай мове, вагалася ад 4 да 6 працэнтаў. «Нават калі ў нейкім пункце правядзення ЦТ быў толькі адзін абітурыент, які выказаў жаданне здаваць тэст на беларускай мове, мы давалі яму такую магчымасць», — запэўніў Мікалай Фяскоў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Абзац

◢ Да ўборкі ранняй бульбы прыступіла сельскагаспадарчае прадпрыемства «Усход» Гомельскага раёна. У першыя дні ўборкі ўраджайнасць перавысіла 200 ц/га, да сярэдзіны ўборачных работ прагназуецца яе павелічэнне да 370 ц/га.

◢ **Супрацоўнікі брэсцкага аддзела ўнутраных спраў на транспарце знайшлі скрадзеныя ў цягніку «Масква—Берлін» пашпарты мэра Смаленска Эдуарда Качаноўскага і яго памочніка. Пашпарты разам з іншымі рэчамі (фотаапарат, візітоўкі, пластыкавыя карткі, а таксама грошы) знаходзіліся ў сумцы ў памочніка, якая і была скрадзеная. Прапажу выявілі каля Брэста, дзе і звярнуліся ў міліцыю. Сумку без грошай знайшлі, пашпарты ўручылі ўладальнікам. Заведзена крымінальная справа.**

◢ Генпракуратура краіны завяла крымінальную справу ў дачыненні да былога начальніка следчага аддзела фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржкантролю Беларусі Генадзя Гапоненкі (злоўжыванне ўладай або службовымі паўнамоцтвамі). Ён узяты пад варту. Пра гэта БЕЛТА паведамілі ў Генпракуратуры. Іншыя падрабязнасці справы пакуль не паведамляюцца.

◢ **Дырэктар Касцюковіцкага УКП «Бытпаслугі» асуджаны за прычыненне ўрону прадпрыемству ў памеры Br12,5 млн. Грошы былі ўзятыя з касы прадпрыемства і выкарыстаны на мерапрыемствы, не прадугледжаныя артыкулам расходаў. Яму прысуджана пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам на 2,5 года з адбываннем у папраўчай калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады тэрмінам 5 гадоў.**

◢ 21-гадовая жыхарка вёскі Чучавічы Лунінецкага раёна затрыманая па падазрэнні ў двайным забойстве — сваёй аднавяскоўкі 1973 г.н. і яе на год маладзейшага сужыцеля. Трагедыя здарылася падчас распіцця спіртнога, прадметам забойства стаў нож.

◢ **Аўтобус ПАЗ згарэў у ноч з 7 на 8 ліпеня ў Слаўгарадзе. Пажар адбыўся на адкрытай пляцоўцы для захоўвання тэхнікі прафесійнага ліцэя. Аўтобус стаяў ушчыльную да будынка сталоўкі навучальнай установы, таму агнём былі пашкоджаны і вокны сталоўкі. Аўтобус згарэў цалкам. Магчымая прычына пажару — падпал.**

◢ Лабавое сутыкненне легкавога аўтамабіля і ЗІЛа прывяло да гібелі трох чалавек у Пухавіцкім раёне. Вадзіцель БМВ, яго жонка і маці загінулі.

Поўны абзац

◢ **У Германіі 6 паліцэйскіх машын 40 хвілін гналіся за трактарам, што рухаўся з хуткасцю 20 км у гадзіну. 23-гадовы немец прыехаў у начны клуб з сяброўкай на яе машыне, аднак дзяўчына з'ехала, не пажадаўшы забраць кавалера з сабой. Тады ён вырашыў транспартную праблему, скраўшы трактар, што стаяў побач, і паехаў дадому. Правоў на кіраванне ў яго не было. Усе спробы паліцыі спыніць яго былі безвыніковымі. Нават упырскванне перцавага газу ў кабіну. На шляху трактара рассцілалі стужкі з шыпамі, але тоўстыя шыны не прабіваліся. Пасля таго, як п'яны «трактарыст» пратараніў паліцэйскі аўтамабіль і сутыкнуўся з іншай машынай, вартавыя парадку пайшлі на радыкальныя меры — расстралялі колы з табельнай зброі і спынілі неўтаймоўны трактар.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

ФАЛЬШЫЎКІ ДРУКАВАЛА... ШКОЛЬНІЦА?

Жыхарка в. Вялікія Якаўчыцы Жабінкаўскага раёна ў сваім доме прадала каля 4.30 гадзін раніцы невядомай дзяўчыне дзве бутэлькі гарэлкі. Пакупніца разлічылася 100-тысячнай купюрай. Жанчына прыгледзелася да тых грошай і пайшла ў міліцыю, бо ёй падалося, што купюра фальшывая. Аператыўнікі высначылі, што гарэлку купляла вучаніца СШ з Жабінкі. А тая заявіла, што грошы падняла з падлогі ў Доме культуры в. Вялікія Якаўчыцы. А хто ж выкінуў тую купюру? Высветлілася, што на фотапрынтары фальшыўку вырабіла іншая вучаніца і быццам бы выкінула яе ў Доме культуры. Вядзецца следства.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ТАКІЯ РОЗНЫЯ СПАКУСЫ

Два металічныя гаражы непрыкметна зніклі з тэрыторыі гаражнага масіва па вуліцы Малініна ў Мазыры. Гаспадары нават не ведаюць дакладна, калі магло адбыцца выкраданне іх маёмасці — кажуць, прыкладна з мая па чэрвень. А вось вялізны летні парасон коштам больш за мільён рублёў знік ноччу. Ён знаходзіўся каля кавярні ў Навабеліцкім раёне Гомеля і, відаць, вельмі спадабаўся невядомаму злачынцу, якога ціпер шукае міліцыя. У тым жа, самым ціхім раёне абласнога цэнтра, у прыватным сектары раптам знік скутар. Яго знайшлі разабраным на часткі каля мясцовага возера. Тым часам у вёсцы Губічы Буда-Кашалёўскага раёна невядомы спакусіўся на... кнігі. Даведнікі па рамонце тэлевізараў і схемы да іх выкрадзеныя з прыватнага дома.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

КІНУЎ СЯКЕРУ, УЗЯЎСЯ ЗА СЕТКІ

Не падпарадкаваўся супрацоўнікам Ганцавіцкай міжрайінспекцыі работнік Клецкага лясгаса, які ў працоўны час кінуў працоўнае месца на высечцы і пайшоў здабываць сеткамі рыбу на сажалках ААТ «Рыбгас «Лактышы».

Пры затрыманні браканьер збег з месца здзяйснення правапарушэння, аднак па наяўных фотаматэрыялах быў знойдзены.

Не падпарадкаваўся супрацоўнікам Полацкай міжрайінспекцыі і работнік ТАА «Лінкор-гандаль», які для абсталявання месца адпачынку здзейсніў незаконную высечку ў прыродаахоўнай зоне возера Вяркудскае Ушацкага раёна. Парушальнік быў у нецвярозым стане, лаяўся, адмаўляўся назваць сябе, спрабаваў уцячы. Супрацоўнік міліцыі, які суправаджаў дзяржінспектараў пры правядзенні прыродаахоўнага рэйду, мусіў выкарыстаць наручнікі. Парушальнік быў дастаўлены ў медвыцвярэзнік.

У абодвух выпадках на парушальнікаў было складзена па некалькі адміністрацыйных пратаколаў, у тым ліку за непадпарадкаванне службовай асобе пры выкананні ёю службовых паўнамоцтваў.

ПАДВЯЛА ЦЯГА ДА РАКАЎ

На адным і тым жа вадаёме Падгорнае Стаўбцоўскага раёна дзяржінспектары на працягу пэўнага часу затрымалі за аднолькавае правапарушэнне — незаконную здабычу ракаў — двух браканьераў. Здзіўляе ў гэтых выпадках улоў затрыманых.

Так, вадзіцель Клецкага лясгаса з дапамогай ластаў і маскі паспеў налавіць 113 асобінаў рака. А менеджар аднаго са сталічных ТАА ў забаронены час, забароненым спосабам здабыў аж 160 вузкапалых ракаў. Тут трэба нагадаць, што з 15 кастрычніка па 15 ліпеня лоўля вузкапалага рака забаронена. Такім чынам прыродным рэсурсам браканьеры нанеслі ў абодвух выпадках урон у асабліва буйным памеры. У дачыненні да вадзіцеля ўжо ўзбуджана крымінальная справа, у дачыненні да менеджара гэта пытанне разглядаецца.

Сяргей РАСОЛЬКА.

«Я ДА ГЭТАГА ЧАСУ СЯБЕ ВІНАВАЧУ, ШТО МАЛА МАМЕ ПІСАЎ...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Дзядзька Рыгор, сёння эпістлярны жанр не дужа ў модзе, з'явіліся лягчэйшыя і хутчэйшыя сродкі сувязі. А тады ліставанне было папулярным? Тэлефон жа ж існаваў ужо...

— Тэлефон быў, але ўсё-ткі была традыцыя пісаць ад рукі. Таму што напісанае ад рукі — яно цяплейшае, яно прайшло праз сэрца. Надрукаванае на машынцы, ці сказанае па тэлефоне, ці праз інтэрнэт — гэта ўсё-ткі халодны, так бы мовіць, афіцыйны жанр. І верш, напісаны ад рукі, — ён цяплейшы. Я, напрыклад, не ўяўляю, каб Біблія першапачаткова набіралася на камп'ютары!..

— У 1954 годзе вы прыехалі ў горад вучыцца — і пачалося маладое, вірлівае, студэнцкае жыццё. Ці лёгка было сярод яго знаходзіць час, каб пісаць маме?

— Стараўся пісаць... Але я да гэтага часу сябе вінавачу, што адносна мала пісаў... Таму што яна была адна, ёй было цяжка. Балюча мне самому перачытваць, як мама папракае мяне за няўвагу... І цяпер, калі на ноч малюся, я заўсёды прашу прабачэння і дзякую маме...

— Нават па памеры адчуваецца, што маміны лісты ў тры разы большыя за вашыя. Мама ўсё апісвае падрабязненька, а сын ёй стэнаграфічна — «накормлены, апрануты, усё добра»...

— Мае лісты напраўду халодныя ў параўнанні з мамінымі. Па іх вельмі добра адчуваецца, як пачынае аддаляцца сын, што паехаў ад мамы ў горад... Але ў мяне праз усё жыццё прайшло адчуванне, што я ў Мінску пражыў, як на кватэры. Таму што там, у Вушачах, мая душа...

— Дзядзька Рыгор, а 50 гадоў таму не было такога, як сёння, калі прыязджае юнак з Барысава альбо з Ляхавічаў — і адразу дужа старацца стаць «мінскім», «гарадскім»?..

— Не! У мяне гэтага ніколі не было! Былі асобныя людзі, але ж гэта адвечнае — што «я ўжо ў горад прыехаў, я ўжо не такі». Стараліся такія забыць і мову, і сарамеліся бацькоў... Неяк, помню, як быў малы, аднойчы ішоў з мамай. І ці адбег ад яе, ці што. Яна гаворыць: «Дурненькі ты, усё адно ўсе знаюць, што я твая мама». Ёй здалося, што я, быццам, не пасарамеўся. Гэтак і з мовай — як беларусы ні стараюцца правільна размаўляць па-руску, усё адно яны беларусы.

— Мяне здзівіла шырыня тэмаў, якія закраналіся ў лістах мамы да сына — мама нават раіла вам, каб на дзяўчат зашмат не глядзеў, каб думаў пра навучанне...

— Так, мама дужа баялася, каб я рана не жаніўся, каб давучыўся. Было так, што прыехала з Рыгі адная дзяўчына ў Вушачы, дык вучыла мяне цалавацца. Мама нас венікам разганяла... Гэта яшчэ нічога. А пасля прыехала культмасавічка такая, трошку старэйшая за мяне. І я як ударыў за ёй, тут мама ўжо добра прыкурыць дала... А калі я жаніўся, яна сказала, каб і жыў ужо, каб ніколі не думаў разводзіцца: «Вочы бачылі, што куплялі».

— У вашых лістах, асабліва першых з Мінска, адчуваецца пэўная ідэалізацыя становішча — і жыву добра, і харчуюся добра, і вучуся добра, і боты купіў... Ці сапраўды ўсё было так бясхмарна?

— Безумоўна, не! Але я стараўся яе суцешыць, таму што ў яе ўсё жыццё было цяжкое. Яна засталася ўдавой пасля вайны, працавала прыбіральшчыцай у райспажыўсаюзе, агарод быў, карову трымала, парася... Яна дужа добра шыла, але не пайшла ў арцель, бо нестава б часу на гаспадарку... У яе не было паняцця «выхадны» ці «свабодны дзень». Яна ўсё жыццё працавала, працавала, працавала. Я гляджу цяпер на наш зарослы агарод — і адчуваю, што кожны сантыметр ейнымі рукамі тут прапалоны і апрацаваны...

— З яе лістоў вынікае, што яна вельмі шмат прадуктаў вам прысылала — і сала, і каўбасы... Відаць, да вашага студэнцкага жыцця ўсе гэтыя харчы былі падмацаваннем добрым?

— Выдатным!..

— Падмацаваннем ці закускою?

— У асноўным падмацаваннем, хаця часам бывала, што і закуссю. Пілі мы нямнога, студэнты. Не было за што. Выпівалі, але павальнай п'янкі не было.

— Мама да вас, студэнта, часта прыязджала?

— Прыязджала мама. Я ж і на кватэрах жыў, дык ёй заўжды былі рады ўсе гаспадыні. І ў маінай хаце пад канец быў ужо як ПЭН-клуб! Хто там толькі ў нас ні быў з паэтаў, празаікаў, мастакоў!.. Але самым любімым у яе госцем быў Уладзімір Караткевіч...

— А сын да мамы часта наведваўся? Далекавата ж ад Мінска да Вушачаў...

— 200 кіламетраў. Тады хадзіў аўтобус, але спыняўся ён ледзьве не ў кожнай вёсцы, таму ехаў паўсутак амаль. І ўбіцца ў яго часам было цяжка. Пасля быў некаторы час самалёт, хадзіў такі «кукурузнік», туды чалавек дзесяць змяшчалася. У Вушачах быў нават невялікі аэрадром, мы былі такія незалежныя. І я лятаў ад мамы і да мамы на самалёце!

— Відаць, ён хвілін за дваццаць далятаў?

— Не, вы ведаеце, самалёт таксама доўга ляцеў, бо як і аўтобус, рабіў прыпынкі, ці пасадкі. Яму не трэба было аэрапорта — ён і на роўнае поле сесці мог. Квіткі былі не дужа дарагія, але затое — з вецярком!..

— У маміных лістах у кнізе захаваны арыгінальны правапіс — і ўсе пампалкі, і змяшаныя беларускія і рускія словы...

— Я ўдзячны Наталлі Давыдзенцы за тое, што яна настаяла, каб нічога не мяняць. Бо адзін час я думаў давесці гэта да літаратурнай мовы. Але ўсё захавалася — і гэта ёсць своеасаблівы узор жывой, нашай мовы, выдатны твор для філолагаў.

— Невялікая частка вашых лістоў да мамы напісаны па-руску. Адкуль такія пераходы?

— Гэта мама мне некалі напісала, каб пісаў па-руску, бо яна не ўсё разумее. Я ж, як студэнт-філолаг, стараўся пісаць літаратурнай беларускай мовай... А мама ведала вушацкую, крывіцкую мову... Мне таксама, калі прыйшоў на філфак, цэнтральна-літаратурная мова была чужая. У Вушачах быў нават жарт такі. Каманда піянерам: «Піянеры, крок раўняй!» А па-вушацку «крок» — гэта шырынка. Вось і рагаталі мясцовыя, калі чулі...

— Дзядзька Рыгор, а цяпер, калі ваша з мамай перапіска выйшла ў выглядзе кнігі, у вас няма адчування, што нешта інтымнае, асабістае вынесена на паказ да публікі?..

«Было так, што прыехала з Рыгі адная дзяўчына у Вушачы, дык вучыла мяне цалавацца. Мама нас венікам разганяла...

— Было, вядома ж... Але я проста захацеў, каб захавалася ўсё, што з мамай звязана. Да таго ж, у гэтых лістах відаць, з якой бядоты я выйшаў, і як мама клапацілася, трэслася нада мной, дыхала на мяне... Ніхто, апроч мяне, не расчытаў бы гэта...

— Што галоўнае вы ўзялі ад мамы?

— Самае галоўнае — мова. Я яшчэ калі на печы сядзеў, мама гаварыла, што ёсць руская мова, а ёсць беларуская, наша — беларуская. Мама навучыла мяне жыць з Богам. Засталося маміна ўспрыняцце свету — усё блізка да душы бяру. Я ўсё жыццё стараўся ісці па маміным шляху. І кажу, што ўсё добрае мне засталося ад мамы, а ўсё дрэннае — сам набыў.

Глеб ЛАБАДЗЕНКА.
Фота аўтара.



Рыгор Барадулін кажа, што ўсё добрае яму засталося ад мамы, а ўсё дрэннае сам набыў...

«Во як я табе не нада стала» *(урыўкі з кнігі)*

(Май 1969 г.)
Добрый день, мой сыночак!

Во як я табе не нада стала, ни слова не написав за павтара месяца, не позванив, а кали дабрався позванить, дак спать лёг. Дякуй невестачке, што атветила, а то схадила б на пошту як дурак пасидела и дамов пашла б. Красуйся, мой сынок, табе светлый день прышов, а мене тёмная ноч агарнула — аслабела, пастарела, никому не нада стала. Каб у тибе хоть крошку жали ка мне было, мог бы прыехать хоть на два дни, паглядеть, як я тут здоров'ем, хоть ба градку на цыбулю закапав, так я захварэла, дякуй за саседев, што не кинули, хто чым мог, тым памагали.

Видать, твайму дастоинству я стала низка, мне писать, ка мне ездить не нада. Так я табе многа нажала, можа, што грошы шлеш. Не шли, мой сынок, толькы маей смерти не жди, ена сама ка мне прыдеть. Дают мне шаснацать рублей, мне их хватить. Прашу: боли николи не шли.

Мой сынок, можа, я табе груба написала, но даруй, ты мене да гетага давёв, бо я ужо то даждала, што мне казали люди: «Пагади-пагади, увидиш, што табе будеть, ужо наругаюца».

Як можна у нас отпуск правесьти, скольки едуть з Масквы, Ленинграду к нам, а табе не хочаца са мной быть. Илонку тожа не хуже было, хоть аддахнула ат гораду. Типер у нас автобусы ходят на льнозавод разов 7 на дни, к возеру и у Арехавна, екая там красата. У «Лесные азёры» типер бы Илонку прывезли, а после б через месяц сами прыехали, усё нарастеть дома, и ягады, и вишни, чарешни. Сёлета так усё твитить ва всих, што сказать неек. Но гета табе усё дрень, што я табе пишу ти кажу, для тибе усё стала низка. Дай бог табе усего найлучшага, што на свьете ёсть, будь шчаслив. Так ты мене растроив, прышла с пошты, каб часок заснула, што пазвать к телефону и не падайти. Усё хатев мой голас чуть, а вжо не нада став.

(22 верасня 1969 г.)
Дарагая і любая мамачка!

Не думай, што я забыўся на цябе, што не помню цябе, мая залаценькая, мая даражэнькая, мая зязюлька баравая, мой самы святы чалавек на зямлі!

Новая кватэра, новая работа1. Пакуль бальшыну звалю са сваёй галавы — усё няма як выехаць ва Ушачы. Па рабоце як навічка убадзюлілі дзяжурным па ўсім нумары — а гэта дужа многа чытаць, і што непрыемнае, быць у Мінску. Ды яшчэ напісаць старонак 15 культурнай хронікі. Так-сяк управіўся. А цяпер новыя клапоты — стэлажы для кніг зашклёныя. Кнігі будуць стаяць у маім кабінеце. Досыць у тых адкрытых надыхаліся пылам! Хачу, каб усё больш-менш было ў парадку да твайго прыезду. Казы сёлета няма — няма табе сёлета і абэлкі.

Ёсць гарачая вада. Газ таксама. Пакуль што ладзяць ліфт. Да твайго прыезду ён будзе вазіць цябе хутка і добра.

Пасля 25 чысла прышлю табе трошку грошай. А то зароблены у мяне ёсць, а атрымаць усё не мог ніяк.

Ілонка вучыцца добра — на «4» і «5». Тройкі таксама ў гаспадарцы згадзяцца. Карацей кажучы, усё, як у людзей. Дужа часта цябе ўспамінае. Дужа любіць цябе.

Любая мамачка, неўзабаве прыеду хоць на трошку. А потым дайдо ў Мінск. Табе трэба палечыцца. Не трэба запускаць хваробу!

Мамачка, ты ў мяне адна-адзіная на белым свеце. Шануй сябе. Купі сабе што-небудзь цёпленькае на ножкі.

Яшчэ раз цалую ручкі твае, кланяюся табе зямным паклонам.

Твой дуронік Інька.

Македонская тэнісная дружына прыбыла ў Мінск

А яе трэнер і капітан не супраць схадзіць на футбол за кошт гаспадароў

Угэтыя выхадныя нацыянальная каманда па тэнісе правядзе матч за захаванне прапіскі ў 1 групе Еўра-Афрыканскай зоны супраць тэнісістаў з Македоніі. Сустрэча пачнецца 10 ліпеня на кортах Мінскага Палаца тэніса. Супраць беларусаў (капітан каманды Уладзімір Валчкоў заявіў на матч 19-гадовага Уладзіміра Ігнаціка, 32-гадовага Максіма Мірнага, 21-гадовага Аляксандра Бурага і 17-гадовага Паўла Філіна) згуляюць Лазар Магдзінчаў, Томас Ятоўскі, Ілля Марціноўскі і Дзмітар Грабулоўскі.

Македонская дружына ўжо прыбыла ў беларускую сталіцу. Капітан каманды Дэян Марынкавіч прызнаўся, што задаволены прыёмам у Мінску, і адзначыў, што выдатныя ўмовы правядзення спаборніцтваў у Беларусі захаваліся з тых нядаўніх часоў, калі наша каманда выступала і прымала супернікаў Сусветнай групы. Фаварытам матчу капітан македонскай каманды лічыць усё ж беларусаў, якія выступаюць дома і на не зусім зручным для македонцаў корце з харт-пакрыццём. Тым не менш Дэян Марынкавіч лічыць, што ў Кубку Дэвіса рэйтынг не заўсёды з'яўляецца вызначальным, вялікую ролю ў гэтых спаборніцтвах адыгрывае настрой

Кватэрнае пытанне

КАЛІ ЗГОДЫ НЯМА...

Наша сям'я (бацькі і трое дзяцей) займае 3-пакаёвую непрыватызаваную кватэру. Дарослы, але не жанаты сын рашыў падзяліць асабовы рахунак і атрымаць у карыстанне адзін з пакояў. Ці магчыма гэта без згоды бацькоў і іншых членаў сям'і?

Г. А., *Віцебск.*

Не, немагчыма. Па-першае, асобны фінансава-асабовы рахунак сведчыць аб наяўнасці самастойнага права карыстання жылым памяшканнем. Ён адкрываецца пасля заключэння дагавора найму жылога памяшкання, па ім налічваюцца плацяжы за абслугоўванне жылля і камунальныя паслугі. Таму падзяліць асабовы рахунак можна толькі пры змяненні дагавора найму.

Па-другое, згодна з жыллёвым заканадаўствам, поўнагадовы член сям'і наймальніка кватэры мае права з пісьмовай згоды апошняга і іншых членаў сям'і, якія пражываюць з ім, патрабаваць прызнання яго наймальнікам па раней заключаным дагаворы найму замест першапачатковага наймальніка. Такое ж права ёсць у любога дзеяздольнага члена сям'і ў выпадку смерці наймальніка або страты ім права на жылое памяшканне.

Поўнагадовы член сям'і наймальніка мае права таксама патрабаваць заключэння з ім асобнага дагавора найму, калі з пісьмовай згоды астатніх поўнагадовых членаў сям'і, якія пражываюць з ім, і ў адпаведнасці з плошчай жылога памяшкання, якая прыпадае на яго долю (або ў адпаведнасці з пагадненнем аб парадку карыстання кватэрай, заключаным паміж яе жыльцамі), яму можа быць выдзелены ізаляваны пакой.

Віктар САВІЦКІ.

ПЛАТФОРМЫ ЗАКРЫЮЦЬ АД ДАЖДЖУ

Над усімі пасажырскімі платформамі мінскага чыгуначнага вакзала з'явяцца навесы. Як расказалі ў аддзеле капітальнага будаўніцтва Мінскага аддзялення Беларускай чыгункі, да канца гэтага года плануецца цалкам добраўпарадкаваць 4-ю платформу. Акрамя ўстаноўкі навесаў тут таксама заменяць асфальтавае пакрыццё пліткай і ўстановяць новыя бартавыя сценкі. Налета аналагічныя работы намечана правесці на платформе № 3, а таксама ўздоўж 17-га пуці і на платформе для пасажыраў прыгарадных электрацягнікоў уздоўж пуцей 22—24.

Міхаіл МІХАЙЛАЎ, «Мінск—Навіны».

Управляющий РУП «Торговый Дом Белхлебопродукт»

ПРОВОДИТ ТОРГИ

по продаже имущества, складской базы, в составе: складские помещения №№ 1, 2, 3 общей площадью 2593 кв.м; 2 административных здания площадью 105,1 кв.м, 66,1 кв.м; крановой эстокады с 2 кран-балками по 5 т каждая, площадь 1440 кв.м. Рядом ж. д. станция «Беларусь». Под обслуживанием объектов недвижимости сформировано три земельных участка: 0,1084 га; 0,5319 га; 0,5854 га.

Имущество расположено по адресу: **Минский р-н, г. Заславль, ул. Привокзальная, 2.** Начальная цена с НДС — 1 370 000 000 бел. руб.

Торги состоятся 23 июля 2009 г. в 12 часов по адресу: г. Минск, ул. Академическая, 14 (здание хоз. суда г. Минска), к. 201.

Контактные телефоны: 8 (029) 6140269, 8 (029) 1209856.

Твае правы

«ПАНІЖЭННЕМ» НЕ КАРАЮЦЬ

Калі мы кажам, што кожны работнік мае пэўныя абавязкі, то нельга забываць і пра «адваротны бок медаля» — абавязкі працадаўца. На жаль, часта апошняе застаецца нібыта за кадрам, а між тым статыстыка сведчыць, што летась праверкі заканадаўства аб працы былі праведзены больш чым у 25 тысячах арганізацый краіны і па сутнасці ніводны візіт дзяржінспектара не абышоўся без канстатацыі таго ці іншага парушэння.

Прычыны маглі быць рознымі: ад простага няведання да свядомага грэбавання прававымі нормамі. Але наступствы ў большасці выпадкаў аднолькавыя — вінаватыя службовыя асобы панеслі пакаранні. Якія і за што? Менавіта гэтай тэме і была прысвечана чарговая on-line канферэнцыя з удзелам спецыялістаў Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны: начальніка ўпраўлення прававога забеспячэння і нагляду Алены КАМІСАРАВАЙ, намесніка начальніка прававога забеспячэння і нагляду Вадзіма Браташа, намесніка начальніка ўпраўлення арганізацыі нагляду і кантролю Тамары КРАМКО і кансультанта Марыны ГРЫШУКЕВІЧ.

Дамовы перш за ўсё

Фінансавы стан арганізацыі — рэч заўсёды галоўная. Але якой бы складанай сітуацыя ні была, яна не можа лічыцца «ўважлівай прычынай» для затрымкі выплаты зарплаты. Работнікі павінны атрымліваць свае грошы ў дні, вызначаныя ў калектыўным або працоўным дагаворы. У адваротным выпадку вінаватым пагражае штраф: у памеры ад 10 да 100 базавых велічынь на юрыдычную асобу і ад 4 да 20 базавых велічынь — на наймальніка або яго ўпаўнаважаную асобу.

Дарэчы, аналагічнае пакаранне Кодэкс аб адміністрацыйных парушэннях прадугледжвае і яшчэ ў адным выпадку — калі ў арганізацыі ў адвольным парадку змяняюцца тэрміны выплат. А ў сваю чаргу гэтыя тэрміны вызначаюцца зноў-такі калектыўным ці працоўным дагаворам.

«Кампенсацыі» ў любым выпадку

Не сакрэт, што стаўленне да практыкі заключэння кантрактаў далёка не адназначнае. Але тут жа нялішне нагадаць: для работніка, які заняты на ўмовах тэрміновага дагавора, вызначаныя пэўныя «кампенсацыі» — павелічэнне тарыфнай стаўкі ці акладу да 50 % і даванне да 5 дадатковых дзён адпачынку. Пры гэтым павышэнне акладу ўсяго на 1 % і толькі 1 «лішні» дзень адпачынку парушэннем не будзе. А вось адсутнасць такіх «бонусаў» увогуле — ужо так. Прычым у гэтым выпадку ёсць падстава звярнуцца ў дзяржінспекцыю працы — упаўнаважаную службовую асобу пакараюць штрафам ад 4 да 20 базавых велічынь.

Закон не «забываюць»

Таксама вельмі «папулярнае» парушэнне — затрымка выдачы работніку працоўнай кніжкі пры звальненні. Нібыта некалькі дзён «адтэрміноўкі» — справа не страшная. Аднак санкцыі ў дачыненні да ўпаўнаважанай службовай асобы наймальніка тут будуць усё тыя ж: штраф ад 4 да 20 базавых велічынь. І, апроч таго, наймальнік можа вызначыць сваёй упаўнаважанай асобе дадатковае «пакаранне» ў выглядзе прыцягнення да дысцыплінарнай адказнасці.

Хто хавае — рызыкуе

Яшчэ адна сур'ёзная тэма — бяспека працы. Скаргаў з боку работнікаў тут шмат, таму нялішне ведаць: парушэнне тэхнікі бяспекі, правілаў па ахове працы ці прамысловай санітарыі наймальнікам ці адказнай асобай можа пацягнуць за сабой штраф у памеры ад 20 да 50 базавых велічынь, а на юрыдычную асобу — нават да 300 БВ. Прычым у выпадку паўтарэння гэтых жа парушэнняў на працягу года «стаўкі» ўзрастаюць: штраф у дачыненні да наймальніка ці адказнай асобы ўжо вагаецца ў межах 30—50, а ў дачыненні да юрыдычнай асобы — у межах 100—400 базавых велічынь.

Адметна, што Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях вызначае адказнасць і за спробу... «не афішаваць» няшчаснае здарэнне на вытворчасці або прафесійнае захворванне. У такім выпадку наймальнік можа заплаціць штраф ад 2 да 10, індывідуальны прадпрымальнік — ад 10 да 50, а юрыдычная асоба — ад 50 да 100 базавых велічынь.

Калі бухгалтар памыліўся...

Застрахавацца ад бухгалтарскіх памылак немагчыма. Аднак пытанне ў іншым: што чакае бухгалтара, які няправільна налічыў грошы і тым самым нанёс арганізацыі матэрыяльны ўрон у памеры... менш за сваю зарплату?

Зрэшты, адказ тут відавочны: суму ўрону ўтрымаюць з заробку бухгалтара. Аднак пры гэтым наймальнік абавязаны запатрабаваць пісьмовае тлумачэнне, выдаць распараджэнне аб утрыманні ўрону не пазней чым праз два тыдні з дня яго «адкрыцця» і пачаць «спаганяць» выплаты не раней чым праз 10 дзесяць дзён пасля адпаведнага паведамлення работніку.

На падзел патрэбна згода

Пры складанні графіку водпускаў работнік выказаў пажаданне адпачыць без перапынкаў. Кіраўнік вырашыў па-іншаму і падзяліў водпуск на дзве часткі. А ў выніку — парушыў заканадаўства. Яно вызначае, што за выключэннем асобных, прадугледжаных калектыўным дагаворам выпадкаў, падзел на часткі (адна з якіх не можа быць меншай за 14 каляндарных дзён) магчымы толькі па ўзаемнай згодзе. І калі такой згоды работнік не даў, то ён можа аспрэчыць рашэнне наймальніка ў камісіі па працоўных спрэчках ці ў судзе.

Без тлумачальнай — немагчыма

Падстаў для прыцягнення работнікаў да дысцыплінарнага спагнання шмат. Але бяда ў іншым: часта гэта робіцца з парушэннямі. У прыватнасці, наймальнікамі не вытрымліваюцца тэрміны (не пазней за адзін месяц з дня высвятлення і шэсць месяцаў з дня здзяйснення), з работніка не бяруць тлумачальную запіску, не знаёмяць з загадам пад роспіс на працягу 5 дзён. І больш за тое: калі-нікалі наймальнік выкарыстоўвае спагнанні, якія не прадугледжваюцца заканадаўствам, — скажам, строгія вымовы ці нават перавод на пасаду з больш нізкай аплатай...

Выйсце ў гэтым выпадку — таксама зварот у інспекцыю працы. Дзяржінспектарам дадзена права складаць пратаколы на наймальнікаў — гэтыя пратаколы накіроўваюцца на разгляд суда. Прычым у выніку вінаватыя службовыя асобы наймальніка могуць заплаціць штраф ад 20 да 100 базавых велічынь.

Спрачайся. Але з дагаворам

Як сцвярджаюць у дэпартаменце, аднавіць свае правы і прыцягнуць да адказнасці вінаватых наймальнікаў цалкам рэальна. Але пры адной вельмі важнай умове — наяўнасці працоўнага дагавора з абавязковым указаннем канкрэтнай зарплаты на дзень яго падпісання, тэрмінаў выплаты заробкаў, працягласці асноўнага і дадатковага водпуску, рэжыму працы і адпачынку. Прычым сам дагавор павінен быць абавязкова пісьмовым. Бо даказаць што-небудзь на падставе вусных дамоўленасцяў — амаль нерэальна.

Сяргей ГРЫБ.

НЯДОЎГА МУЗЫКА ІГРАЛА

Трое маладых людзей, з якіх адзін ліцэіст, ноччу выкралі з аўтамашын па вул. Дуброўскай і Беларускай у Брэсце 4 магнітолы, радыёстанцыю, набор інструментаў, заранае прыстасаванне... Усяго было абрабавана 5 машын. Злодзеяў затрымалі. Скрадзенае вярнулі гаспадарам.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

АД ЦЫРКА НА «ВУШАТЫМ»

...захацелася пакатацца невядомаму грамадзяніну ў Гомелі, які выкраў аўтамабіль «Запарожац» («ЗАЗ»-968) 1987 года выпуску, прыпаркаваны ля будынка дзяржаўнага цырка ў цэнтры Гомеля. Як паведамляе прэс-служба УУС Гомельскага аблвыканкама, машына была знойдзена супрацоўнікамі ДАІ ў прыватным сектары горада з механічнымі пашкоджаннямі і пустымі бутэлькамі ўнутры.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

«Калідор зацьменняў» — час фатуму

777

7 ліпеня адбылося паўценявое месяцавае зацьменне, якое «адкрыла» цэлы калідор зацьменняў (22 ліпеня пройдзе сонечнае кальцавое зацьменне, 6 жніўня — яшчэ адно месяцавае паўценявое). Як сцвярджаюць астролагі, у гэты прамежак часу з намі будуць адбывацца непазбежныя, фатальныя падзеі, якія немагчыма прадухіліць. У гэты перыяд усё, што з намі адбудзецца, будзе мець адбітак прадвызначанасці лёсу. Падзеі «калідора зацьменняў» даюцца нам для ўсведамлення і выпраўлення сваіх памылак, становяцца фундаментам для фарміравання нашай будучыні. Астролагі раяць пільна сачыць за ўсімі зменамі, якія адбываюцца ў нашым жыцці ў гэты перыяд, нават самымі, здавалася б, дробнымі, прыслухоўвацца да свайго ўнутранага рытму. Пасля 6 жніўня гнёт фатальнасці значна аслабее, і ў нас зноў з'явіцца свабода выбару.

Месяцавае зацьменне, чый уплыў будзе адчувацца на працягу тыдня (паводле іншых сцвярджэнняў, аж да сонечнага зацьмення 22 ліпеня!), раскрывае пытанні, якія месяцамі (а то і гадамі) заставаліся схаванымі. Месяцавае зацьменне ў астралогіі азначае прарыў у адносінах, час, калі «ўсе карты выкладзеныя на стол». Калі вы былі занятыя пошукам кагосьці ці чагосьці — вы знойдзеце гэта падчас уплыву месяцавага зацьмення. На першы план выходзяць пытанні ўзаемаадносінаў і кантактаў: нехта ў гэты час пакладзе канец свайму свабоднаму існаванню і абярэцца шлюбам ці пазнаёміцца з будучым абраннікам, нехта, наадварот, верне сабе незалежнасць, скасаваўшы шлюб.

У гэты час трэба вельмі ўважліва ўспрымаць любую інфармацыю — абсалютна нечакана перад намі могуць раскрыцца некаторыя таямніцы. Пры гэтым трэба памятаць, што ўплыў зацьмення скажае наша ўяўленне аб рэальнасці. Ёсць рызыка праявіць залішнюю саманадзейнасць, неасцярожнасць, паглыбіцца ў высвятленне адносінаў, дарэмна расходаваць энергію і грошы, паддацца спакусам. Для змякчэння верагоднага негатыўнага ўплыву зацьмення неабходна канцэнтрацыя ўвагі, цярпенне і памяркоўнасць. Самае важнае — імкнуцца пазбягаць агрэсіі і негатыву ў любой форме. Падчас месяцавага зацьмення добра развітацца з усім, што ўжо не патрэбна (дрэннымі звычкамі, рысамі характару, сумненнямі ў сваіх сілах і здольнасцях).

Цікава, што прадвызначанасць нашага лёсу ў час «калідору зацьменняў» зусім не нагода для пасіўнасці і інертнасці. Астролагі тлумачаць, што падчас месяцавага зацьмення трэба быць асцярожнымі, але прадпрымаць больш актыўныя дзеянні, скіраваныя на аб'ект нашых памкненняў, не баяцца рызыкаваць. Логіка тут простая: гэта ўсё адно перыяд фатуму, і чаму быць, таго не мінуць.

Пачынаючы з 9 ліпеня Сонца будзе фарміраваць гарманічны планетарны аспект з Сатурнам, што павінна сцішыць эмацыйную нестабільнасць, выкліканую месяцавым зацьменнем. Пасля ўваходжання Марса ў знак Блізнятаў, якое адбудзецца 12 ліпеня, распачнецца адзін з найбольш плённых перыядаў лета. Гэта час творчасці і актыўных дзеянняў на карысць індывіда і грамадства. З'явяцца шанцы для пошуку кампрамісаў для ўрэгулявання канфліктаў, якія раней узніклі. Уваходжанне Меркурыя ў задыякальны знак Льва (18 ліпеня) плюс сукупнасць гарманічнага планетарнага аспекту паміж Сонцам і Уранам палепшаць клімат у грамадстве на ўсіх узроўнях — ад дзяржаўнага да сямейнага. Пазітыўны ўплыў касмічных целаў будзе адчувацца да канца другой дэкады месяца. Аднак уплыў маладзіка і сонечнага зацьмення 22 ліпеня, узмоцнены пераходам Сонца ў задыякальны знак Льва і дысгарманічным аспектам паміж Венерай і Сатурнам, зноў абвостраць сітуацыю. Верагодныя ўспышкі эмоцый, узаемных прэтэнзій, зрыў намечаных планаў. Канец месяца чакаецца сумбурным.

Падрыхтавала Іна АРЭХАВА.

Внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Белгорхимпром»

состоится 20 июля 2009 года в 11.00 по адресу: г. Минск, пр. Машерова, 17, актовый зал (3 этаж).

Повестка дня:

1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.

Регистрация акционеров — в день проведения собрания с 9.00 до 10.30 по адресу: г. Минск, пр. Машерова, 17, актовый зал (3 этаж).

УНП 600024712.

ДАЖДЖЫ ІДУЦЬ, А ГРЫБЫ НЕ РАСТУЦЬ

Лепшае надвор'е для грыбоў і прыдумаць цяжка — ноччу дождж і парнасць. І хоць на базары толькі лісічкамі гандлююць, вырашыў паехаць на праверaныя часам мясціны — пад Слонім.

У чатыры гадзіны мабільнік зайграў бадзёрую мелодыю, і я расчыніў акно. Сыпаў ціхі дождж, і, пастаяўшы з хвіліну, пайшоў спаць, але доўга не вытрымаў і падаўся ў гараж, бо грыбы — гэта хранічная хвароба. Бывае, едзем са знаёмым на дызелі пад той жа Слонім. Мой спадарожнік глядзіць у акно і пачынае хвалявацца. У кустах прычыгункі бачныя сыраежкі, мухаморы... І хоць да нашага прыпынку яшчэ кіламетраў дзесяць, чалавека пачынаюць біць дрыжыкі. Ён не можа ўсядзець на месцы і задоўга да выхаду ідзе ў тамбур.

Дарога свабодная, дождж суцішыўся, і праз 15 хвілін машына з моста над «алімпійкай» павярнула да Новай Мышы. Меліярацыйныя канавы перапоўненыя, і вада залілa сенажаць. Старадаўняе мястэчка абмінулі па аб'язной магістралі, праехалі міма Жамчужнага — «пасёлка развітога сацыялізму». Тут дамы ў некалькі паверхаў, а агароды для вяскоўцаў — у полі, за вярсту ад дома.

Напярадзе 15 км роўнага асфальту, і так аж да Палонкі. Палі наўкол зелянеюць, але калі надвор'е не зменіцца, то плакалі нашы запланаваныя цэнтнеры. Месцамі пшаніцу і ячмень моцна паклала — уражанне, што на палях асфальтавы каток паездзіў.

За мосцікам, у нізіне, ляжыць Палонка. Рэчка Іса хоць і невялікая, але даволі маляўнічая, а пра мястэчка так не скажаш. Сёння ў Палонцы нічога адметнага няма, хоць гісторыя ў вёскі багатая. У 1660 годзе шляхецкае войска гетмана П. Сапегі пад Палонкай нанесла паражэнне ваяводзе Хаванскаму, ды і пазней тут палкі Вялікага Княства ўступалі ў схватку з непрыяцелем.

За Палонкай асфальт закончыўся і цяпер кіламетраў восем лесам — па гравійцы. Хоць дарога і не з горшых, але дужа не разгонішся — ямы трапляюцца. Як толькі мінулі мяжу з Гродзеншчынай, то і спыніліся на абочыне.

Жонка засталася ў машыне за вартаўніка, а я з сынам, прыхапіўшы кашы ды пакеты на ўсякі выпадак, падаліся на аблюбаваныя мясціны — кіламетры за чатыры.

Ісці ў грыбы наўздагад — марная трата часу. Іншая справа, калі ведаеш, што ў гэтым месцы можна набраць баравікоў і ў тым — таксама, але цёмных, бо на тоўстых ножках пад елкамі растуць. У апенек і зялёнак свае мясціны, і, бывала, у грыбны год пакуль да іх дойдзеш, то грыбоў поўныя кашы набярэш — розных. А затым сартуеш — пакідаеш толькі баравікі. Здаралася выкідваць і баравікі — замяняць больш маладымі. Усё як у жыцці. Калі ёсць выбар, то можна перабіраць.

Увайшлі ў лес, а на вочы грыбы не трапляюцца, а гэта кепская прыкмета. Калі грыбы ёсць, то яны на кожным кроку. А тут прайшлі з паўкіламетра і, акрамя некалькіх нахіленых сыраежак, — нічога.

У лесе вільготна і цёпла, але грыбы жывуць паводле сваіх законаў. Вунь добры ўраджай на рыжыкі толькі адзін раз на восем гадоў бывае. Лічыцца, што баравікі-каласавікі з'яўляюцца тады, калі жыта каласіцца, але гэта не заўсёды так.

Некалькі разоў падалося, што трапілі на баравікі. Вырвалі адзін-другі, а капялюшыкі знізу руковыя. Не паверылі вачам, пакаштавалі на язык — так, жоўчны грыб.

Праверылі ўсе знаёмыя мясціны і назбіралі лісічак. Можа, кілаграм — на дваіх малавата. Праз тыдзень настане час гэтых грыбоў, а пакуль што лісічкі толькі вылазяць на свет божы.

Акрамя нас, грыбнікоў у лесе не было, а вось чарніцы жанчыны збіралі. Ягад шмат і буйныя, але нас яны не цікавілі. Праўда, суніцы зрэдку зрывалі, бо іх таксама багата. А калі вярталіся да машыны, усё ж знайшлі два баравікі. Яшчэ маленькія, і адзін з іх моцна чарвівы.

Пры ўсіх прыкметах ёсць адна самая праверaная і якая яшчэ ніводнага разу не падвяла. Калі на рынку з'явіліся мужчыны з пакамечанымі тварамі і са смуткам у вачах ды з кашамі грыбоў у руках — можна ехаць у лес. А пакуль некалькі жанчын прапаноўваюць у слоіках лісічкі — яшчэ не грыбная пара.

Загнаў машыну ў гараж і, калі вяртаўся дамоў, на аўтобусным прыпынку сустрэў знаёмага — Мішу Пікуса.

— Ты адкуль? — пытаецца. Відаць, яго зацікавіў мой выгляд — не нядзельны.

— Ды вось у грыбы ездзілі.

— І як, многа назбіралі?

— Можа, які кілаграм лісічак.

— І куды ездзіў? — ажывіўся знаёмы.

— Кіламетраў за трыццаць пяць, пад Слонім.

— Які сэнс ва ўсім гэтым, — здзівіўся Міша, — пайшоў бы на рынак і за грошы, якія аддаў на бензін, купіў два кілаграмы лісічак, і ногі ў цябе сухія былі б, і кляшча не баяўся б...

Падышоў аўтобус, і Пікус, прыціснуўшы да грудзей кейс, стаў у чаргу да дзвярэй.

І сапраўды, якое ліха пагнала мяне сёння ў лес? — падумаў я. Вось у наступныя выхадныя... Але сцэнарый, падазраю, паўторыцца.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Гомельский областной территориальный фонд государственного имущества

проводит 17 июля 2009 г. повторный аукцион

по продаже объектов недвижимости государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества.

ЛОТ № 1

Производственная база:

- капитальные строения – битумоплавильное отделение инв. № 310/С-1449, цех изоляции труб с пристройкой и навесами инв. № 310/С-1450, административно-бытовой корпус с пристройками инв. № 310/С-1451, бетонное покрытие инв. № 310/С-26148, линия электропередачи инв. № 310/С-26149 и инв. № 310/С-26150, водопровод инв. № 310/С-26151, хозфекальная канализация инв. № 310/С-26152, ливневая канализация инв. № 310/С-26153, линия электросвязи инв. № 310/С-26154;

- низковольтная аппаратура (низковольтное оборудование 0,4 кВт);

- котельная автономного отопления;

- право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества.

Сведения о предмете аукциона: здания из кирпича и бетонных плит, общей площадью 1691,5 кв.м.

Местонахождение: Гомельская обл., Гомельский р-н, н.п. Залипье.

Условия использования – для производственного и административно-бытового назначения.

Земельный участок – **2,9551 га.** *Срок аренды земельного участка* – **49 лет.**

Начальная цена единого предмета аукциона – **1 060 416 448** рублей, в т.ч. имущества – **997 733 946** рублей, права заключения договора аренды земельного участка **– 62 682 502** рубля.

Задаток, вносимый участником, – **30 000 000** рублей.

Продавец: имущества – республиканское производственное унитарное предприятие «Гомельоблгаз», тел. (0232) 42-15-45; права заключения договора аренды земельного участка – Гомельский райисполком, тел. (0232) 36-42-04.

ЛОТ № 2

Капитальное строение (здание компрессорной), инв. № 342/С-38664 и право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества.

Сведения о предмете аукциона: одноэтажное кирпичное здание, общей площадью 100 кв.м, кровля – шиферная, год постройки – 1980.

Местонахождение: Гомельская обл., ст. Светлогорск.

Условия использования – для производственных, коммунально-складских целей.

Земельный участок – **0,0172 га.** *Срок аренды земельного участка* – **25 лет.**

Начальная цена единого предмета аукциона – **11 833 240** рублей, в т.ч. имущества – **11 544 190** рублей, права заключения договора аренды земельного участка – **289 050** рублей.

Задаток, вносимый участником, – **500 000** рублей.

Продавец: имущества – транспортное республиканское унитарное предприятие «Гомельское отделение Белорусской железной дороги», тел. (02334) 6-22-33; права заключения договора аренды земельного участка – Светлогорский райисполком, тел. (02342) 2-09-85.

Организатор аукциона – фонд «Гомельоблимущество», г. Гомель, проспект Ленина, 3, контактные телефоны (0232) 70-14-72, 74-90-27.

Аукцион проводится **17 июля 2009 г. в 11.30 по адресу: г. Гомель, проспект Ленина, 3.**

Торги проводятся в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Желающим участвовать в аукционе необходимо в срок до 17.00 16 июля 2009 г. заключить с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон и представить организатору аукциона следующие документы: заявление на участие в аукционе по установленной форме; заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающую внесение задатка на счет организатора аукциона, указанный в извещении; нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации; юридическим лицом – доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; представителем иностранного юридического лица или иностранного гражданина, лица без гражданства – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе участники или их представители предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Организатор аукциона вправе снять объект с торгов до объявления его проданным.

Задаток перечисляется на расчетный счет фонда «Гомельоблимущество» **№ 3642927330048** в филиале **№ 300** АСБ "Беларусбанк" г. Гомель, код **МФО 151501661, УНН 400243904.** Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гомель, проспект Ленина, 3, фонд «Гомельоблимущество», **ком. 406, с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00** по рабочим дням по **16 июля 2009 г.** включительно.

Заключительная регистрация участников **17 июля 2009 г. с 10.00 до 11.15.**

Победитель аукциона в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполкомом решения о предоставлении ему земельного участка, обязан внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, расходы, связанные с формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией создания земельного участка.

После совершения победителем аукциона названных платежей, но не позднее 2 рабочих дней, с ним продавцом заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка. Оплата за приобретенный объект осуществляется в течение 30 календарных дней после подписания договора купли-продажи.

Извещение о ранее объявленном аукционе было опубликовано в газете «Звязда» № 103 (26461) от 6 июня 2009 г.

Информация о продаваемых объектах расположена на сайте Гомельского облисполкома: www.gomel-region.by, и сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь: www.gki.gov.by.

ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова Прэзідыума Цэнтральнага камітэта Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі
23.06.2008 № 24

ПАЛАЖЭННЕ
аб правядзенні конкурсу на стварэнне Гімна Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі

1. Конкурс на стварэнне Гімна Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі (далей — конкурс, Гімн галіновага прафсаюза, галіновы прафсаюз адпаведна) праводзіцца ў мэтах дэмакратычнага адбору мастацкіх твораў (тэкстаў і музыкі) для вызначэння Гімна галіновага прафсаюза, заахвочвання творчай актыўнасці па адлюстраванні прафсаюзнай і галіновай тэматыкі ў музычным мастацтве.

2. Гімн галіновага прафсаюза павінен:

2.1. адпавядаць статусу галіновага прафсаюза як галіновага прафцэнтра — добраахвотнай грамадскай арганізацыі работнікаў устаноў і арганізацый адукацыі і навукі, навучэнскай моладзі — паслядоўніка і захавальніка лепшых традыцый прафесійных аб'яднанняў асветнікаў і студэнцкіх таварыстваў Беларусі;

2.2. адлюстроўваць мэты, задачы, метады, прынцыпы і змест дзейнасці галіновага прафсаюза, значэнне яго дасягненняў, бачанне перспектыў развіцця;

2.3. мець інтанацыйна-меладычную якасць, запамінальнасць, урачыстасць, рытм шэсця.

3. Да ўдзелу ў конкурсе прымаюцца тэксты на беларускай мове і музыка да Гімна галіновага прафсаюза (далей — творы). Тэкст твора павінен складацца не больш чым з чатырох чатырохрадкоўяў і прыпеву.

4. Творы разглядае камісія па правядзенні конкурсу на стварэнне тэксту і музыкі Гімна Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі (далей — камісія), склад якой фарміруецца з прадстаўнікоў Цэнтральнага камітэта, абласных і Мінскага гарадскога камітэтаў галіновага прафсаюза, кампазітараў, паэтаў, музыказнаўцаў, філолагаў, дзеячаў беларускай культуры, мастацтва і зацвярджаецца пастановай Прэзідыума Цэнтральнага камітэта галіновага прафсаюза.

5. Конкурс з'яўляецца адкрытым, у ім могуць прыняць удзел як пэўныя асобы, так і творчыя калектывы.

Творы падаюцца пад дэвізам у запячатаным канверце, пазначаным тым жа дэвізам і словамі «На конкурс» . У канверце павінны быць тэкст і ноты твора, пазначаныя дэвізам, пры наяўнасці — гуказапіс на CD-носьбіце. У гэты канверт дадаткова ўкладаецца пазначаны дэвізам і словамі «Звесткі аб аўтары (аўтарах)» другі запячатаны канверт. У ім павінны быць пазначаныя дэвізам звесткі аб аўтары (аўтарах): прозвішча, імя і імя па бацьку, месца працы (вучобы), службовыя і хатнія адрасы і тэлефоны, адрас электроннай пошты.

Канверты, у якіх знаходзяцца звесткі аб аўтары (аўтарах), распячатваюцца пасля падвядзення камісіяй вынікаў конкурсу.

Падача твораў лічыцца згодай на іх публікацыю, выкананне і трансляцыю ў час правядзення конкурсу на сайце галіновага прафсаюза і ў сродках масавай інфармацыі.

Дасланыя на конкурс матэрыялы не вяртаюцца.

Творы, змест якіх не адпавядае патрабаванням гэтага Палажэння, да ўдзелу ў конкурсе не дапускаюцца.

6. Кожны з удзельнікаў конкурсу мае права падаць на разгляд камісіі адзін твор.

7. Творы падаюцца да 1 лістапада 2009 года ў Цэнтральны камітэт галіновага прафсаюза (220126, г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 21, пак. 1307) з пазнакай на канверце «Конкурс Гімна БПРК».

8. Конкурс складаецца з адборачнага і фінальнага тураў.

У адборачным туры камісіяй разглядаюцца ўсе дасланыя ў вызначаныя тэрміны творы і вызначаюцца тры лепшыя з іх для праходжання ў фінальны тур. Рашэнні камісіі ў адборачным туры прымаюцца шляхам галасавання, форму якога вызначае камісія.

У фінальным туры з вызначаных у адборачным туры трох лепшых твораў камісіяй па выніках абмеркавання шляхам тайнага галасавання вызначаецца твор-пераможца конкурсу, які прапануецца камісіяй для зацвярджэння ў якасці Гімна галіновага прафсаюза.

Рашэнне камісіі лічыцца прынятым, калі за яго прагаласавала больш за палову членаў камісіі.

9. Пры разглядзе твораў камісія кіруецца наступнымі крытэрыямі:

9.1. адпаведнасць зместу тэксту ўмовам конкурсу;

9.2. мастацкі ўзровень твора;

9.3. адпаведнасць твора музычным канонам і прынцыпам напісання гімна.

10. Правядзенне конкурсу шырока асвятляецца на сайце галіновага прафсаюза, у сродках масавай інфармацыі.

Пры падрыхтоўцы да падвядзення вынікаў адборачнага тура конкурсу тэксты дасланых у вызначаныя тэрміны твораў размяшчаюцца на сайце галіновага прафсаюза, пры неабходнасці і наяўнасці адпаведнай магчымасці па просьбе камісіі можа быць наладжана галасаванне на сайце з мэтай вызначэння найбольш упадабаных наведвальнікамі сайта галіновага прафсаюза тэкстаў.

Пры падрыхтоўцы да падвядзення вынікаў фінальнага тура конкурсу пры неабходнасці і наяўнасці адпаведнай магчымасці па просьбе камісіі могуць акыцяўляцца гуказапіс твораў у выкананні адпаведных мастацкіх калектываў, шырокае абмеркаванне вызначаных у адборачным туры твораў на сайце галіновага прафсаюза.

11. Тэрмін падвядзення вынікаў адборачнага тура конкурсу — да 1 снежня 2009 года, фінальнага тура конкурсу — да 1 лютага 2010 года.

12. Па выніках конкурсу Прэзідыум Цэнтральнага камітэта галіновага прафсаюза сваёй пастановай зацвярджае Гімн галіновага прафсаюза. Пры неабходнасці са згоды камісіі на этапе падрыхтоўкі праекта пастановы Прэзідыум Цэнтральнага камітэта галіновага прафсаюза стварае часовую камісію па ўдасканаленні тэксту твора-пераможцы конкурсу.

13. Аўтар (аўтары) твора-пераможцы конкурсу ўзнагароджваюцца дыпломам (дыпломамі) і грашовай прэміяй на падставе пастановы Прэзідыума Цэнтральнага камітэта галіновага прафсаюза. Астатнія ўдзельнікі конкурсу, творы якіх былі дапушчаны да ўдзелу ў конкурсе, узнагароджваюцца дыпломамі. Асобныя ўдзельнікі конкурсу пры наяўнасці рэкамендацый камісіі на падставе пастановы Прэзідыума Цэнтральнага камітэта галіновага прафсаюза могуць быць узнагароджаны каштоўнымі падарункамі ці грашовымі прэміямі.

14. Вынікі конкурсу абвяшчаюцца на сайце галіновага прафсаюза, у сродках масавай інфармацыі.

15. Пасля зацвярджэння Гімна галіновага прафсаюза яго тэкст і ноты публікуюцца на сайце галіновага прафсаюза, у галіновых і прафсаюзных сродках масавай інфармацыі. Па заказу Цэнтральнага камітэта галіновага прафсаюза акыцяўляецца гуказапіс Гімна галіновага прафсаюза ў выкананні адпаведнага мастацкага калектыву.

16. Правядз

КАЛІ СТАРАСЦЬ У РАДАСЦЬ?!

Гераіня публікацыі раней вучыла мужчын кіраваць трактарам, зараз вучыць дзяцей плесці з саломкі

Станіслава Аль вельмі рухавы і жыццярадасны чалавек. Сядзець на лаўцы і лузаць семкі — гэта не для яе. Сумна гэта і нецікава.

— Нават мясцовы ксёндз неяк раз сказаў: «Пані (ён так мяне называе) так хутка ішла, што мы на машыне не маглі абагнаць. Я свайму кіроўцу так і сказаў: гэта мая самая актыўная парафіянка так ходзіць».

З гэтай жвавай жанчынай я пазнаёмілася падчас камандзіроўкі ў Валожынскі раён. Зусім выпадкова. Спытала ў першага сустрэчнага, каго ў Валожыне ўсе ведаюць. І пачула ў адказ — Станіславу Іосіфаўну Аль.

Жыве Станіслава Іосіфаўна ў двухпакаёвай кватэры з прасторнай кухняй і калідорам у цэнтры горада. Зусім адна. Здаецца, навошта ёй такія палацы? «Як навошта? — абураецца гаспадыня. — А куды ж мне падзець свой саламяны пасаг?» Сапраўды, знутры кватэра нагадвае саламяны лялечны домік. Саламяны чайны сервіз, саламяныя кветкі ў саламяных вазах, саламяныя капелюшы, сумачкі, боты... І ўсё гэта зроблена рукамі Станіславы Іосіфаўны.

Здзівілася, калі пачула, што такая творчая натура, як Станіслава Аль, мае тэхнічную адукацыю (скончыла тэхнікум механізацыі). Тры гады яна вучыла мужчын кіраваць трактарам у вучылішчы механізацыі. Там, дарэчы, і сустрэла свайго нарачонага — малодшага на чатыры гады курсанта.

— Пасля ўладкавалася на працу ў школу, — кажа Станіслава Іосіфаўна. — Побач з дзецьмі час праляцеў імгненна. Не паспела і вокам міргнуць, як на твары з'явіліся маршчынкі...

На пенсію спадарыня Станіслава пайшла па выслузе гадоў. Але не па ўласным жаданні. Было так, што памёр муж і яе паставілі перад выбарам: збыць карову ці кінуць працу.

— Памятаю, мама тады сказала: «Дачушка, сястра хварэе, нам малачко патрэбна. Ідзі лепш на пенсію». Што рабіць? Пайшла. Цяжка давялося без дзяцей, урокаў... Было такое адчуванне, што мяне выкінулі на сметніцу, быццам непатрэбную ляльку. Зразумела, што доўга без працы не пратрымаюся. І ўладкавалася весці гурток па саломапляценні ў спецыяльную школу-інтэрнат для дзяцей-інвалідаў, што ў Чэхаўшчыне. Хацелася падтрымаць гэтых дзетак, бо ў мяне ўнук з абмежаванымі магчымасцямі.

Плесці пляцёнку Станіславу Іосіфаўну навучыў старэйшы брат Лёня. А пасля яна сама спляла капялюш, як капялюш — дык і сумачку, як сумачку — дык і кош.

— Дзякуй Богу, фантазіяй мяне прырода надзяліла, ды і схопліваю ўсё імгненна. Дзе што на выставе падгледжу, дзе што прачытаю. У мяне ж не так даўно цудоўная кніга з'явілася. Кватарант падарыў. Я ад яго платы не брала, дык ён мне кнігай вырашыў аддзячыць. Дзецям яе паказала і сама карыстаюся.

Зараз Станіслава Іосіфаўна вядзе гурток па пляценні з саломкі ў Доме дзіцячай творчасці і ў Валожынскай агульнаадукацыйнай школе-інтэрнаце для дзяцей-сірот. Яе выхаванцы пастаянна становяцца пераможцамі не толькі раённых, але і абласных і рэспубліканскіх конкурсаў.

— Вось за гэтага саламянага выратавальніка, — з гонарам дэманструе Станіслава Аль ляльку ў рост чалавека, — мы з дзецьмі ўзялі першае месца ў вобласці і атрымалі грашовую прэмію.

...Напэўна, думаюць людзі, сядзела б гэта старая дома. Але я не адчуваю старасці. Вельмі хочацца быць запатрабаванай. Таму раблю ўсё, што ні папросяць. Трэба на турзлёт лялькі падправіць — калі ласка, заказваюць саламяны букет ці шкатулку — лёгка, капялюш — таксама. Прыкмеціла, што як сяджу дома, усё баліць. Але як толькі выйду за парог — боль як рукой здымае.

Працуе Станіслава Аль дзеля задавальнення. А грошы?.. Якія тут грошы: добра калі 160 тысяч атрымае. Ды і тыя малодшаму сыну аддае. Хоць якая, але падтрымка.

— Раман пайшоў па маіх слядах: вучыць дзяцей з Багданаўскай школы плесці з саломы і лазы. Зарабляе недзе тысяч 250. А ў яго ж жонка і трое дзетак... І ўсе плятуць. Сын зробіць аснову, нявестка перакручвае, а дзеці падхопліваюць.

На развітанне Станіслава Іосіфаўна падзялілася сваімі перажываннямі.

— У верасні школу-інтэрнат у Валожыне зачыняць, а дзяцей расфарміруюць. І ў Доме дзіцячай творчасці, адчуваю, не жадаюць больш трымаць пенсіянера. Не ведаю, што буду рабіць без працы *(уздыхае)*. Адзінота — самае страшнае для старога чалавека. У мяне ж тут, у Валожыне, нікога няма — ні ўнукаў, ні дзяцей. Старэйшы сын жыве за 20 кіламетраў, малодшы, Раман, — за 27, дачка — у Мінску. Штодзень не наездзішся.

Станіслава Аль вельмі рухавы і жыццярадасны чалавек. Сядзець на лаўцы і лузаць семкі — гэта не для яе. Сумна гэта і нецікава.

— Нават мясцовы ксёндз неяк раз сказаў: «Пані (ён так мяне называе) так хутка ішла, што мы на машыне не маглі абагнаць. Я свайму кіроўцу так і сказаў: гэта мая самая актыўная парафіянка так ходзіць».

* * *

Што і каму трэба зрабіць, каб старасць была ў радасць?.. З гэтым пытаннем я звярнулася да **метадыста народнага аб'яднання майстроў «Скарбніца» Валожынскага цэнтра культуры. Таццяна Валянцінаўна ЛАНЬКО** распавяла, што сем гадоў таму ў Валожыне з'явіўся клуб для пенсіянераў «Верас». Яна стаяла ля яго вытокаў.

— У той час я сумяшчала працу ў бібліятэцы з кіраўніцтвам клуба для інвалідаў «Міласэрнасць». Наведвала інвалідаў дома, ладзілі мы нешта для іх... Неяк пры размове з суседкай задумалася: людзям з абмежаванымі магчымасцямі ўвагу аддаём, а пенсіянеры... Дзе і як ім бавіць час? Для моладзі ёсць і бары, і кавярні, і дыскатэкі. А для пенсіянераў толькі лаўкі, семкі ды плёткі... Так атрымліваецца.

На наступны дзень Таццяна Валянцінаўна падзялілася сваімі думкамі наконт стварэння клуба для ветэранаў працы з дырэктарам раённага цэнтра культуры.

«Спрабуй. Усё ў тваіх руках», — пачула ў адказ.

— Першы блін не атрымаўся комам. У другі раз на сустрэчу прыйшло больш за 50 чалавек. Давялося нават прыносіць дадатковыя крэслы і сталы з Дома піянераў, з бібліятэкі. Трэцяя, чацвёртая, пятая сустрэча... Мае пенсіянеры маладзелі на вачах. Ведаеце, было такое адчуванне, што ў іх адкрылася другое дыханне.

Не пакідалі без увагі ні аднаго наведвальніка клуба. Кожны расказваў пра сябе, дзяліўся ўспамінамі. Разам спявалі, чыталі вершы. Многія раскрылі ў сабе таленты, пра якія і самі не здагадваліся. Ездзілі па магчымасці на экскурсіі ў Мір, Нясвіж, Мінск. А неяк раз старшыня райвыканкама выдзеліў нам бясплатна аўтобус, каб наведаць Жыровіцкі манастыр. Усе дні нараджэння таксама святкавалі разам. Рабілі юбілярам сюрпрызы. Напрыклад, адной жанчыне сын (ён ваенны, таму дома бывае рэдка), якога мы запрасілі, прысвяціў песню. Дамаўляліся на віншаванне з прадстаўнікамі тых калектываў, дзе раней працавалі пенсіянеры. Адным словам, ёсць што ўзгадаць.

У хуткім часе на базе клуба быў створаны хор ветэранаў, яму прысвоена званне народнага.

— Але, на жаль, два гады таму хор аддзяліўся ад клуба. Зараз абедзве суполкі ўзначальваюць таленавітыя жанчыны, якія маюць музычную адукацыю. Магчыма, таму ў горадзе ветэраны працы займаюцца выключна самадзейнасцю. А хацелася б, каб як і задумвалася першапачаткова, клуб працаваў у розных кірунках. Дзейнічалі б секцыі па гімнастыцы, шашках, шахматах, драматычны гурток, гурток па вышыванні. Каб штомесяц ладзіліся тэматычныя вечарыны, сустрэчы з проста цікавымі людзьмі, а таксама з прадстаўнікамі розных арганізацый (спецыялістамі натарыяльнай канторы, жыллёва-камунальнай службы, урачамі).

Надзея ДРЫЛА, фота аўтара.
Валожынскі раён.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ПАРК «БЕЛАВЕЖСКАЯ ПУШЧА» — ЗА КРОК АД ТЫТУЛА ЦУДУ СВЕТУ

Цяпер праходзіць міжнародны інтэрнэт-конкурс «Новыя 7 цудаў свету», удзельнікам якога можа стаць кожны карыстальнік Сусветнай сеткі. Неабходна толькі аддаць свой голас за таго або іншага намінанта на сайце http://www.new7wonders.com, паведамляе карэспандэнт БЕЛТА. Арганізатар гэтага конкурсу — швейцарскі фонд New 7 Wonders Foundation («Новыя 7 цудаў свету»). Мэта праекта — стварэнне спіса сямі цудаў прыроды. Выдатныя прыродныя мясціны свету размеркаваны па сямі катэгорыях: ландшафты, астравы, горныя ўтварэнні, вулканы, нацыянальныя паркі, лясы, марскія ўтварэнні. Чарговы адборачны этап пройдзе 7 ліпеня. Вынікі інтэрнэт-галасавання будуць аб'яўлены ў 2011 годзе.

Інфарм-укол

Летняя цяжарнасць і абязводжванне

Цяжарнасць сама па сабе — нялёгкі перыяд, а ў спякотны час года становіцца яшчэ большым выпрабаваннем.

Перш за ўсё спецыялісты звяртаюць увагу на важнасць спажывання вялікай колькасці вадкасці, паколькі абязводжванне можа прывесці не толькі да галаўнога болю, слабасці і ванітавання, але нават да схватак і заўчасных родаў. Гэта можа адбыцца з-за парушэння метабалічнага балансу, які ўзнікае ў выніку недахопу вадкасці ў маці і эмбрыёна.

Цяжарнай жанчыне неабходна піць не менш за 3 літры вады ў дзень (калі няма пэўных проціпаказанняў). Неабходна мець на ўвазе, што першымі прыкметамі абязводжвання з'яўляюцца адчуванне смагі, пачашчаны пульс, млоснасць, павышаная нервовасць. Медыкі нагадваюць, што абязводжванне можа наступіць незаўважна — напрыклад, падчас працяглага знаходжання ў пакоі, дзе працуе кандыцыянер. Да абязводжвання могуць таксама прывесці ваніты і дыярэя. Наступныя стадыі абязводжвання характарызуюцца моцнай слабасцю, галавакружэннем, моцным галаўным болем, парушэннем слінааддзялення, моцным і хуткім пульсам і з'яўленнем ранніх схваткаў.

Што такое арытмія сэрца?

Гэта парушэнне частаты, рытмічнасці і паслядоўнасці скарачэнняў аддзелаў сэрца. Арытміі могуць узнікаць пры структурных змяненнях у праводнай сістэме пры захворваннях сэрца і (або) пад уплывам вегетатыўных, эндакрынных і іншых метабалічных парушэнняў, а таксама пры інтаксікацыях і шэрагу лекавых уздзеянняў.

У норме сэрца чалавека скарачаецца пад уздзеяннем імпульсаў, якія ідуць з сінусовага вузла з частатой 60—80 удараў у хвіліну. Такі рытм называецца сінусовым. Любы рытм, які адрозніваецца ад апошняга, называецца арытміяй сэрца. У залежнасці ад віду арытміі клінічныя праявы могуць быць самымі разнастайнымі: перабоі, пачуццё спынення сэрца, сэрцабіццё, задышка, боль у вобласці сэрца, зніжэнне артэрыяльнага ціску і г.д. Небяспека любой арытміі ў тым, што яна можа прывесці да гібелі хворага. Таму важна як мага раней выявіць гэты стан. Адлюстраванню апошняга дапамагаюць танометры — сучасныя прыборы для вымярэння артэрыяльнага ціску.

Вядучая рубрыкі Святлана БАРЫСЕНКА.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.50	21.39	16.49
Віцебск —	4.31	21.37	17.06
Магілёў —	4.39	21.30	16.51
Гомель —	4.45	21.17	16.32
Брэст —	5.06	21.53	16.47
Гродна —	5.16	21.45	16.29

Месяц

Поўня 7 ліпеня.
Месяц у сузор'і Вадалея.

Імяніны

Пр. *Георгія, Давыда, Дзяніса, Івана, Ціхана.*

К. *Веранікі, Зянона, Мікалая.*

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

НАДВОР'Е на заўтра

...у суседзяў

Варшава	+17..+19°C	Кіеў	+24..+26°C
Рыга	+13..+15°C	Вільнюс	+20..+22°C
Масква	+22..+24°C	С.-Пецярбург	+24..+26°C

Дзве даты

9 ліпеня

1944 год — у Мінску адбыўся першы масавы выхад гараджан на суботнік па аднаўленні сталіцы. Згодна з інфармацыяй першага сакратара Мінскага ГК КП (б)Б Глебава, у ім прынялі ўдзел больш як 25 тысяч чалавек.



1762 год — гвардыя ўзвяла на расійскі прастол Кацярыну II, скінуўшы яе мужа, імператара Пятра III. Менавіта ў час яе кіравання адбыліся тры падзелы Рэчы Паспалітай (1772, 1793, 1795). Аўтар многіх белетрыстычных, драматургічных, публіцыстычных сачыненняў, «Запісак».

Цытата дня:

«Вялікія людзі бываюць вялікімі нават у малым».

Люк дэ Вавенарг (1715—1747), французскі пісьменнік.

ЧАЦВЕР

свет і сусвет ЧАЛАВЕКА

● Святога Давіда, які ўшаноўваецца ў гэты дзень, у народзе звалі Сунічнікам, таму што да гэтага часу ўжо паспяваюць суніцы.

● «На Ціхвінскую суніцы паспяваюць, дзевак у лес па ягады клічуць» — гэты дзень быў пачаткам збірання суніц. Суніцы, якія вы з'елі ў гэты дзень у вялікай колькасці, аднаўляюць кроў.

● Пчаляры лічылі, што на Ціхвінскую пчала вылятае мёд збіраць.

Суніцы — духмяны, салодкі дарунак лесу. З прыходам хрысціянства на славянскія землі суніцы сталі сімвалам праведнасці, шчырасці, а добрыя справы, здзейсненыя чалавекам, часам звалі «пладамі», маючы на ўвазе менавіта суніцы. Знахары і лекары звалі суніцы «падарункам Бога», таму што менавіта яны дапамагаюць чалавеку ад розных хваробаў, пра што было напісана яшчэ ў траўніку XII стагоддзя.

● Суніцы (свежыя ягады) ужываюць пры гіпертаніі, туберкулёзе, захворваннях вачэй, крыві, а таксама як сурацьзапаленчы сродак.

● Густы сіроп са свежых суніц выратоўвае скуру ад з'яўлення рабаціння.

● На Русі існавала такое павер'е: таму, хто жадае пазычыць грошай, трэба пакласці лісце суніц у кішэню і ісці прасіць — ніхто не адмовіць.

Каб прыйсці з лесу з ягадамі, перад тым, як зайсці ў лес, неабходна сказаць так:

«Святыя, ідзіце мне на дапамогу, ягад набярыце, усё мне падарыце. Амін».

Калі ідзяце ў лес (абярэг)

«Ішоў пан Езус дарожкай, нікога не спаткаў: ні псоў, ні ваўкоў, ні гадзюкаў, ні злых людзей. Пайду і я за ім па яго слядочках, па яго сцежачках, каб я нікога не спаткала».

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Прыгожае жыццё

ДЫЗАЙН СА СМАКАМ

Напрыканцы чэрвеня ў 40 краінах свету стартаваў прыём работ на VI Міжнародны конкурс дызайну «Artzept 2009». Беларусы хоць і пачалі ўдзельнічаць у ім толькі летась, затое адразу прадэманстравалі высокі ўзровень — па выніках папярэдняга конкурсу работы нашых суайчыннікаў увайшлі ў лік фіналістаў і былі ўключаны ў спецыяльны мастацкі каталог і перасоўную выставу, што на працягу года аб'едзе ўсе краіны-ўдзельніцы.

«Мы прызвычаіліся да поспеху дызайнераў з Заходняй Еўропы. Аднак летась беларусы прыемна здзівілі: першы год удзелу — і такія цудоўныя работы! — адзначыла арт-дырэктар міжнароднага конкурсу «Artzept» Гордана Біба Маркавіч. — Спадзяёмся, што поспехі суайчыннікаў натхняць і іншых беларускіх дызайнераў, і сёлета яны пазмагаюцца з нашымі пастаяннымі ўдзельнікамі за галоўныя прызы».

У чым, уласна, трэба змагацца? Конкурс «Artzept», арыентаваны на маладых дызайнераў, ладзіцца па ініцыятыве міжнароднай кампаніі Zepter International з 2004 года і дае магчымасць праявіць сябе ў кірунку «хоўм арт», якому ў нейкай ступені адпавядае таксама назва «прамысловы дызайн». Галоўная мэта конкурсу — праз прадметы побыту і інтэр'еру папулярызаваць ідэю здаровага ладу жыцця, спалучыць бізнэс і мастацтва, функцыянальнасць рэчаў і іх аздабленне. Дадатковая складанасць у тым, што фантазію дызайнерам трэба прыкладаць не да вялікіх рэчаў — мэблі або бытавой тэхнікі, а да дробных, паўсядзённых, але, тым не менш, вельмі важных для адчування хатняй утульнасці элементаў — посуду.

Летась, напрыклад, тэмай конкурсу стала ёмістасць для печыва. Дызайнеры з пяці кантынентаў убачылі яе па-рознаму — ад экалагічнага варыянта, стылізаванага пад клад дроў, да касмічнага яйкападобнага кокана з пластыка і шкла, ад экзатычнага кітайскага ліхтарыка да імітацыі гарадской забудовы... Беларускія канкурсанты ў лік прызёраў не трапілі, але іх творы не згубіліся на фоне іншых, больш як 300, дасланых работ: Ірына Бараноўская аформіла сваю вазу ў выглядзе цыліндра ілюзіяніста, адкуль тырчаць забаўныя заечыя вушы, а Андрэй Слаук зрабіў незвычайную шкляную кветку, якая падобная адначасова і на вазу, і на плафон для свяцільніка.

— Маю работу можна выкарыстоўваць у абедзвюх іпастасях, — пацвердзіў нашу здагадку сам аўтар, — увечары падобны свяцільнік дае вельмі прыемнае, мяккае святло і стварае адчуванне ўтульнасці. Увогуле я больш люблю займацца дробнымі элементамі, якія ўпрыгожваюць дом — мазаікай, роспісам, але пры неабходнасці магу і цалкам інтэр'ер кватэры афарміць, такія заказы былі, хоць і даволі рэдка.

Перамогу ў выніку міжнароднае журы, складзенае з дызайнераў-практыкаў і мастацтвазнаўцаў з Сербіі, Італіі, Нарвегіі і Чэхіі, прысудзіла ўдзельніку з Чэхіі Стэфану Гудзеву. У якасці галоўнага прыза, між іншым, пераможца атрымлівае ўнушальную суму ў памеры 10 тысяч еўра. За другое і трэцяе месца прызёрам дастаецца прадукцыя кампаніі Zepter на суму 4 і 3 тысячы еўра адпаведна. «Гэткі ж прызавы фонд усталяваны і сёлета, і мы ведаем, што ў Беларусі вялікія шанцы прэтэндаваць на самыя высокія ўзнагароды, таму застаецца толькі пажадаць беларускім дызайнерам актыўнасці і ўдачы», — зазначыла генеральны дырэктар Zepter International у Беларусі Ірына Плашчынская.

Сёлета тэма конкурсу — «Чай удваіх», чайны набор для прыгатавання і сервіроўкі, абавязковым элементам якога павінен быць заварачны чайнік. Арганізатары папярэджваюць, што работы павінны быць унікальнымі, з аўтарскім подпісам — а таксама не класічныя. Затое пажадана, каб у работах быў адлюстраваны прагрэс, а таксама заклапочанасць станам навакольнага асяроддзя. Заяўкі на ўдзел дызайнеры павінны даслаць да 20 кастрычніка праз афіцыйны сайт конкурсу www.artzept.com, а ўласна работы — у галаўны офіс кампаніі Zepter International у Мілане (Італія). Далей ужо справа за журы, якое вызначыць пераможцаў і адбярэ найлепшыя работы для наступнага каталога і перасоўнай выставы. У перспектыве плануецца будаўніцтва асобнай мастацкай галерэі ў Бялградзе або Мілане, дзе будуць выстаўленыя ўсе конкурсныя калекцыі ўсіх гадоў.

А вось на далейшае развіццё сваіх ідэй у прамысловых маштабах маладыя дызайнеры, на жаль, разлічваць не могуць, хіба што пашанцуе, калі каталог з лепшымі работамі зацікавіць буйных заказчыкаў.

МЕРКАВАННЕ ЭКСПЕРТА

Старшыня Беларускага саюза дызайнераў Дзмітрый СУРСКІ:

— Гэты міжнародны праект — добрая падмога маладым аўтарам, бо ў нашай краіне рэалізавацца прамысловым дызайнерам вельмі цяжка, практычна немагчыма. Падобных конкурсаў у Беларусі не ладзіцца, да нас хіба што адгалоскі з іншых краін даходзяць.

— Выснова зразумелая: з прамысловым дызайнам у нас усё сумна. Ці могуць беларусы пахваліцца поспехамі ў іншых сферах дызайну?

— Пахваліцца ёсць чым — хоць адзінкавыя прарывы нельга лічыць агульнай тэндэнцыяй, тым не менш, нагоды для гонару ў нас ёсць. Напрыклад, у Міланскім мэблевым салоне летась і сёлета паспяхова выстаўляліся беларускія дызайнеры. Пэўныя дасягненні ёсць у сферы дызайну інтэр'ера — ёсць майстры, якія сталі знакавымі не толькі ў Беларусі, але і ў Расіі, Літве, Германіі, Швецыі, Іспаніі. Хапае таленавітых веб-дызайнераў, тым больш што гэта сфера дазваляе працаваць у аддаленым рэжыме; беларускія мадэльеры — Самошчанка, Цакаленка, Айплатаў і іншыя — заўжды радуюць; сярод нашых дызайнераў-графікаў ёсць імёны сусветнай велічыні, без перабольшання.

— Чаму ж іх работы не бачныя ў паўсядзённым жыцці беларусаў — суайчыннікі эканомяць, тым больш у крызіс?

— Не думаю, што так — хутчэй гэта выдаткі мыслення, бо кіраўнікі рознага звяна, якія прымаюць рашэнні і выдзяляюць грошы, маюць вельмі слабае ўяўленне пра работу дызайнераў. Але, думаю, сітуацыя зменіцца, і попыт на прафесію і адукацыю павялічыцца і ў нас, а колькасць работ з цягам часу абавязкова пяройдзе ў якасць.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК. Фота аўтара.

Усміхнёмся!

Дзве сяброўкі, замужнія.

— Мужу пры выпуску з дзіцячага садка ў школу давалі характарыстыку «Таварыскі, добра есць і гуляе» — ведаеш, за 30 гадоў нічога не змянілася.

☺

— Вось вам, прадаўцам, каго складаней за ўсё аблічваць?

— Іншых прадаўцоў.

☺

Дзве сяброўкі.

— Божухна, як ты мяне напалохала!

— На сябе паглядзі!

☺

Люблю свой двор. Крыкі маленькіх дзяцей, стук мяча аб асфальт, звон шкла, віск сігналізацыі, крык «чорт, матаем адсюль!» і вясёлы тупат дзясяткаў ножак...

☺

82-гадовы стары прыходзіць да доктара:

— Я на наступным тыдні ажанюся, доктар!

— Ну, гэта нядрэнна! І колькі гадоў нявесце?

— 18.

— Я павінен вас папярэдзіць, што празмерная актыўнасць у ложку можа мець смяротны фінал!

— Хай памірае, яшчэ раз ажанюся!

BelSwissBank
БЕЛОРУССКО-ШВЕЙЦАРСКИЙ БАНК

Наименование банка:
ЗАО «Белорусско-Швейцарский банк БелСвиссБанк»

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2009 года

(в млн. белорусских руб.)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	01.07.2009	01.07.2008
1	2	3	4	5	6
1	АКТИВЫ				
2	Денежные средства	1101	1	25 300,6	20 180,1
3	Средства в Национальном банке	1102	2	10 407,7	14 356,2
4	Ценные бумаги	1103		4 250,0	12 540,2
	для торговли	11031	3	198,3	1 361,6
	удерживаемые до погашения	11032	3.1.	-	-
	в наличии для продажи	11033	3.2.	4 051,7	11 178,6
5	Кредиты и другие стредства в банках	1105	4	49 632,4	28 476,4
6	Кредиты клиентам	1106	5	5 240,0	6 176,0
7	Долгосрочные финансовые вложения	1107	6	15,0	15,0
8	Основные средства и нематериальные активы	1108	7	30 978,8	14 899,2
9	Прочие активы	1109	8	19 413,0	10 509,3
10	ИТОГО активы	110		145 237,5	107 152,4
11	ОБЯЗАТЕЛЬСТВА				
12	Средства Национального банка	1202	9	-	-
13	Кредиты и другие средства банков	1205	10	33 853,6	26 974,9
14	Средства клиентов	1206	11	71 072,8	56 789,2
15	Ценные бумаги, выпущенные банком	208		98,5	38,4
16	Прочие обязательства	1209	12	2 838,3	1 024,1
17	ВСЕГО обязательства	120		107 863,2	84 826,6
18	КАПИТАЛ				
19	Уставный фонд	1211	13	26 400,0	17 150,0
20	Эмиссионный доход	1212		-	
21	Резервный фонд	1213		4 081,6	2 586,7
22	Накопленная прибыль	1214	14	1 419,2	252,9
23	Фонд переоценки статей баланса	1215	15	5 473,5	2 336,2
24	Всего капитал	121		37 374,3	22 325,8
25	ИТОГО обязательства и капитал	12		145 237,5	107 152,4
26	ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ				
27	Требования	1301	16	50 746,2	28 733,7
28	Обязательства	1302	17	54 163,1	25 553,9

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 июля 2009 года

(в млн. белорусских руб.)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	1 июля 2009 г.	1 июля 2008 г.
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		1 272,6	1 103,7
2	Процентные расходы	2012		2 300,8	871,3
3	Чистые процентные доходы	201	18	-1 028,2	232,4
4	Комиссионные доходы	2021		5 881,4	3 023,4
5	Комиссионные расходы	2022		611,7	402,0
6	Чистые комиссионные доходы	202	19	5 269,7	2 621,4
7	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	203	20	8 191,6	6 458,7
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	21	71,9	-153,3
9	Доход в форме дивидендов	205		1,8	-
10	Чистые отчисления в резервы	206	22	61,7	146,4
11	Прочие доходы	207	23	1 323,8	1 427,7
12	Операционные расходы	208	24	9 297,4	7 295,0
13	Прочие расходы	209	25	667,0	420,5
14	Налог на прибыль	210		776,8	443,0
15	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2		**3 027,7**	**2 282,0**

Председатель Правления В.А. Казбанов
Главный бухгалтер И.И.Трепашко

Лицензия Национального банка РБ на совершение банковских операций № 7 от 29.12.2008 г.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 47 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 32.345. Індэкс 63850. Зак. № 3665. Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12